ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарновым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., інакгародзія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСЯГО СВЕТУ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-10
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 11 жніўня 1930 г.
№ 185 (3784)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Барацьба за хлеб—барацьба за пяцігодку за чатыры гады

Хлебазагатоўчая кампанія мае вялізнае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Пасьпяховы вынік загатовак падвядзе цьвёрды фундамант пад грандыёзнае будаўніцтва трэцяга году пяцігодкі.

У гэтым годзе Савецкі Саюз зноў мае магчымасьць выступіць на замежным рынку як буйны экспарцёр хлеба. Ня толькі забесьпячэньне харчамі ўнутраных патрэбнасьцяй краіны, але і ўвесь наш імпартны плян, нашае будаўніцтва сацыялістычнай індустрыі ў значнай ступені будзе залежаць ад пасьпяховай барацьбы ў бліжэйшыя тыдні і месяцы хлебазагатоўчай кампаніі.

«Барацьба за хлеб — барацьба за сацыялізм», — заявіў Ленін у гарачыя гістарычныя дні нашае рэвалюцыі. Гэтыя словы ў пэўным сэнсе захоўваюць сваё значэньне і для бягучага пэрыяду сацыялістычнае рэканструкцыі. Праўда, **тады** ішла сьмяротная бойка за непасрэднае фізычнае існаваньне першае рэспублікі працы. **Тады** пралетарыят рабіў гэраічныя намаганьні, каб разамкнуць цеснае кальцо з белагвардзейскай сволачы і інтэрвэнтаў. **Цяпер** ідзе непасрэдная барацьба за сацыялістычную пераробку мільёнаў савецкіх гаспадарак, цяпер бяруцца сацыялістычныя вяршыні на базе суцэльнае калектывізацыі і буйной індустрыі.

Барацьба за хлеб — барацьба за сацыялізм. **Барацьба за хлеб — барацьба за генэральны плян сацыялістычнае рэканструкцыі, барацьба за пяцігодку ў чатыры гады.** І толькі заядлы апартуністы можа не разумець вялізарнага палітычнага значэньня тых клясавых баёў, якія пяхўхіла адбудуцца вакол хлебазагатовак.

25 проц. нашага беларускага хлебазагатоўчага пляну гэтага году павінен выканаць аграмаджаны сэктар сельскае гаспадаркі. Гэта — вялізарны посьпех, гэта — вялікі крок наперад. Але гэтыя лічбы ў той самы час гавораць аб неабходнасьці на меншай увазе індывідуальнаму сэктару, чым у мінулым годзе. 75 проц. хлеба здае індывідуальнік. Нашы партыйныя, савецкія і прафэсіянальныя арганізацыі павінны зрабіць з гэтага адпаведныя вывады.

ЦК УсеКП(б) у пастанове ад 26 ліпеня папярэджвае, што «ня гледзячы на значнае паслабленьне кулацтва ў выніку посьпехаў калектывізацыі і палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, кулак усё яшчэ захаваў значную сілу ў некаторых раёнах, **у асаблівасьці ў раёнах з нізкім процантам калектывізацыі.** (Падкрэслена намі. — Рэд.). ЦК прапануе партыйным арганізацыям падрыхтавацца і арганізаваць рашучы адпор кулацтву, мабілізуючы шырокія масы беднякоў і сераднякоў».

Практыка першых дзён загатовак у БССР яскрава пацьвярджае правільнасьць і своячасовасьць папярэджаньня ЦК УсеКП(б).

Кулак ужо разгортвае вялікую актыўнасьць. Агітуючы супроць продажу хлеба дзяржаве, супроць выкананьня кантрактацыйных дагавораў клясавы вораг прабуе дэзарганізаваць наш рынак забесьпячэньня. Кулак злучаецца са спэкулянтам і мяшочнікам, выступаючы адзіным фронтам супроць сацыялістычнага будаўніцтва. У Петрыкаўскім раёне, напрыклад, кулакі пашыраюць правакацыйныя чуткі, што «ўрад пасадзіць усіх сялян на хлебны паёк — 8 кілёграм у месяц». На жаль, актыўнасьці клясавага ворага петрыкаўскія арганізацыі процінаставілі толькі сваю пасыўнасьць. Ніякай растлумачальнай работы ў раёне не праводзіцца.

Прынцыпы загатовак у гэту кампанію застаюцца летапнія. Пляны загатовак павінны быць даведзены да кулацкага двара. Кулакам трэба прад'яўляць цьвёрдыя заданьні здачы збожжа. Задача савецкага грамадзкага працаўніка сачыць за няўхільным выкананьнем гэтых заданьняў.

Бязьлітасна перасякаючы кулацкі сабатаж загатовак, з карэньнем выкарчоўваючы спробы хлебнае забастоўкі з боку кулака, трэба не дапускаць перанясеньня мер узьдзейнасьці, ужываных да кулака, на сераднякоў. Перагібы будуць дзейнічаць толькі на руку кулаку, будуць толькі ўзмацняць яго пазыцыі.

Мабілізацыя вясковай грамадзкасьці адна з неабходных умоў правядзеньня кампаніі. Арганізуючы камісіі садзейнасьці саміх сялян і калгасьнікаў, разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі, сёламі, актывізаваўшы групы беднаты, дэлегацкія сходы калгасьніц і сялянак, камсамол, ставячы на абгаварэньне сходаў калгасьнікаў і індывідуальнікаў намечаныя пляны, ужываючы мэтады грамадзкага ўзьдзейнічаньня, — мы створым умовы для рашучай перамогі на хлебным фронце.

«Трэба шырока разгарнуць работу грамадзка - палітычных арганізацый і мабілізаваць бядняцка - серадняцкі актыў да пасьпяховага выкананьня пляну хлебазагатовак незакантрактаванымі гаспадаркамі ў парадку грамадзкага самаабавязацельства». (З пастановы ЦК УсеКП(б).

Хлебазагатоўчая кампанія ў БССР ўжо фактычна пачалася. Чырвоныя абозы пацягнуліся да загатоўчых пунктаў і баз. Ці падрыхтаваліся мы да спатканьня хлеба? Ці ня будуць нашы арганізацыі захвачаны хлебным патокам зьнянацку?

Весткі, якія паступаюць з месц, прымушаюць нас даць адмоўны адказ на гэта пытаньне. Ні нашы нізавыя партыйныя арганізацыі, ні загатоўшчыкі, ні грамадзкасьць не мабілізаваліся яшчэ для барацьбы за хлеб. Загатоўчыя пляны не даведзены да калгасу, да сяла і кулацкага двара. Камісіі садзейнасьці ва многіх мясцох не арганізаваны. Растлумачальная работа яўна невыстарчальная.

Яшчэ горш з тэхнічным узбраеньнем кампаніі. Мы зьвяртаем увагу нашых чытачоў на карэспандэнцыю са Слуцку, зьмешчаную ў сёнешнім нумары «Зьвязды». Слуцак — буйны хлебны раён. Ён павінен нарыхтаваць каля 1.500.000 пудоў збожжа. Між тым, няма ні складаў, ні тары. Замест 30.000 мяшкоў, загатоўчыя арганізацыі маюць толькі 5.000. Аналёгічны малюнак і ў многіх іншых раёнах. Некаторыя арганізацыі толькі цяпер прыступаюць да пабудовы складзкіх памяшканьняў.

Сур'ёзнай увагі патрабуе да сябе транспарт. Нядбайнасьць, павольнасьць, непаваротлівасьць транспартных арганізацый стварае сур'ёзную пагрозу кампаніі. Ужо цяпер паведамляюць аб заторах па чыгуначных станцыях Жлобіну, Магілеву, Слуцку і г. д. Што-ж будзе, калі краіна патрабуе ад транспарту перавозкі вялізарнае колькасьці грузаў?

Начальнік станцыі Калінкавічы распусьціў ударную брыгаду грузчыкаў. Замест сацспаборніцтва, замест ударніцтва жлобінскі бюракрат уводзіць арцельную «кружку». Старая арцель, з яе ўраўнілаўкай (зарплата падзяляецца пароўну), з дапатопнымі традыцыямі ад дубінушкі замяніла сабой брыгаду энтузіястых працы, ударыла па новых формах сацыялістычнага спаборніцтва.

Работу транспарту пад шырокі грамадзкі кантроль! Рашучы ўдар па бюракратах, якія зрываюць выкананьне адказьнейшых заданьняў! На суд грамадзкасьці тых, хто тушыць рабочую ініцыятыву!

Хлебазагатоўчая кампанія новы **экзамен** для ўсіх нашых партыйных арганізацый. **Не спадзяючыся на самацёк,** загадзя ўлічыўшы ўсе цяжкасьці, падрыхтаваўшыся да іх перамогі, тэхнічна ўзброіўшыся, — яны разам з рабочай і вясковай грамадзкасьцю вытрымаюць з посьпехам гэты экзамен. Барацьба за хлеб, барацьба за сацыялізм павінна быць і будзе закончана з бліскучай перамогай.

Фашызацыя Латвіі

РЫГА, 9. Латвійскія фашыстыя (так званыя бэргістыя ад імя фашысцкага дэпутата Бэрга)і іх орган «Латвіс» працягваюць усеяк хваліць [illegible] латвійскіх фашыстых—лапуасцаў і заклікаюць «латыскі народ» вучыцца ў фінаў».

«Латвіс» у перадавой піша, што лапуаскі рух аьяўляецца ня толькі анты-камуністычным рухам, але і рухам супроць парлямантарызму. Лапуасцы паводле заявы аўтара артыкулу Асерса, хочуць стварыць сапраўдную «моцную» нацыянальную ўладу» і «латвійскі народ можа толькі вучыцца ў лапуасцаў».

Сам дэпутат Бэрг таксама адгукнуўся вялікай перадавой у газэце «Латвіс». На лапуаскі рух. Берг піша, што з моманту выступленьня лапуасцаў фашызацыю бальтыцкіх дзяржаў трэба лічыць наогул закончанай, бо да самага апошняга часу Фінляндыя была адзіным краем, дзе гэты «пералом» яшчэ ня быў праведзены ў жыцьцё».

Бэрг сьцьвярджае, што фашысцкі «пералом» праведзен цяпер ва ўсіх бальтыцкіх дзяржавах, у тым ліку і ў Латвіі.

«Кульмінацыйны пункт дэмакратыі Латвія перажыла ў 1927 годзе ў вэрыяд левага ўраду,—піша Бэрг.—Калі-б левы ўрад Сэмэнэка праіснаваў далей, то магчыма, і ў нас пералом у бок фашызму адбыўся-бы ў тых-жа формах, як і ў Польшчы, Літве і Фінляндыі. Але пералом адбыўся у нас... у парадку канстытуцыйным».

Латвійскія рэвалюцыйныя рабочыя таксама адгукнуліся на бязчынствы лапуасцаў. Усе латвійскія газэты паведамляюць, што гэтымі днямі ў Лібаве зноў ужо ў другі раз **«камуністыя выбілі шыбы ў памяшканьні фінляндзкага консульства,** жадаючы такім чынам выказаць сваю **салідарнасьць з фінскімі камуністымі і пратэст супроць лапуаскага руху.**

Фашысцкая «Латвіс» патрабуе драконаўскіх мер супроць лібаўскіх рабочых.

Хроніка выстаўкі

Прыбыло 2.000 экскурсантаў

Учора [illegible] ўдзелу ва ўрачыстым адчыненьні [illegible] Усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці прыехаў член ЦВК СССР, сакратар бюджэтнай камісіі т. Ветошкін.

Да 3 гадз. дня 10 жніўня ў Менск прыбыло каля 2.000 экскурсантаў рабочых-калгасьнікаў і сялян з усіх округ і раёнаў БССР. Экскурсанты разьмешчаны ў клюбах і чырвоных куткох. Самыя вялікія клюбы Менску — клюб Ільліча і клюб харчавікоў адведзены пад інтэрнаты для экскурсантаў. На вакзале да экскурсантаў прымацоўваецца групавод на увесь час іх прабываньня на выстаўцы.

На выстаўцы адчынены дзьве сталоўкі з прапускной здольнасьцю ў тысячы абедаў у дзень, а таксама ларкі, якія будуць абслугоўваць экскурсантаў. Сёньня ў памяшканьні Дзяржтэатру для экскурсантаў будзе дадзена пастаноўка БДТ 2. Апроч таго для іх забраніравана 250 месц у цырку. З 18 жніўня «Сіняя Блюза» будзе выступаць на адкрытай сцэне выстаўкі.

ПЕРШАЯ УСЕБЕЛАРУСКАЯ ВЫСТАЎКА

СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

АДЧЫНЕНЬНЕ ВЫСТАЎКІ



Ужо з чацьвертай гадзіны рух па Савецкай стаў набываць нязвычайныя формы.

На ўсіх трамвайных астаноўках выстрайваліся чарады...

— Туды, на выстаўку! На Камароўку...

Ня гледзячы на дождж, бліскавіцы і грымоты, пад праліўнымі струменямі шэрае вільгаці, з нахіленымі штандарамі пацяклі да гораду павільёнаў нязьлічоныя рады.

Мабілізаваліся грузавыя паштовыя аўта-машыны.

Паволі, зусім нязвычайна, каціліся на шэрых рэйках перапоўненыя трамвайныя вагоны.

Іх далёка не хапіла. І не зважаючы на неспрыяючае надвор'е, па тратуарах, проста па бруку, ішлі бязупынку на першую Ўсебеларускую выстаўку рабочыя, камсамольцы, служачыя...

На трыбуне, ля помніку Леніну—прадстаўнікі Цэнтральнага Камітэту партыі, ЦВК, СНК, ЦСПСБ, камандваньня Беларускай Вайсковай Акругі, рабочыя і калгасьнікі.

Выстаўку адчыніў ад імя Галоўвыстаўкому наркамзем БССР тав. **Рачыцкі.**

— Выстаўка, якую мы сёньня адчыняем, адна з вялікіх заваёў працоўных БССР,—адзначыў т. Рачыцкі ў сваім выступленьні. Яна зьвяцца адным з фактараў, які замацуе нашы вялікія дасягненьні.

Першая Ўсебеларуская выстаўка зьявіцца школай будаўніцтва сацыялізму і надрыхтоўкай кадраў новых тысяч будаўнікоў сацыялізму.

Рапарт аб пабудове выстаўкі прачытаў дырэктар 1-й Усебеларускай выстаўкі тав. **Дубіна.**

Выстаўка,—кажа тав. Дубіна,—пабудавана там, дзе толькі год таму назад было балота, карчы і хваёвы лес. У пабудове выстаўкі мы прытрымліваліся новых канструкцый.

Усяго на выстаўцы 63 павільёны. Прамысловасьць і сельская гаспадарка, якія паказаны на выстаўцы, зьяўляюцца паказам нашых вялікіх дасягненьняў і далейшых шляхоў будаўніцтва сацыялізму ў БССР.

Ад імя ЦК КП(б)Б выступіў з вялікай прамовай сакратар ЦК тав. **Васілевіч.**

— Таварышы, гаворыць т. Васілевіч, — Кастрычнік разьвязаў вялікія сілы рабочае клясы, бядняцкага і серадняцкага селянства. Вынікі іх работы, іх перамогі мы бачым на выстаўцы. Гэта толькі частачка вялікай работы пабудовы сацыялізму ў рэспубліцы СССР — Савецкай Беларусі, яшчэ ў нядаўнім мінулым зруйнаванай, пакалечанай капіталістымі і інтэрвэнтамі.

Пасьля Кастрычніка ў шматнацыянальнай Беларусі на аснове правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі атрымалі магчымасьць свабодна разьвівацца пачуцьці братэрскай салідарнасьці. Да Кастрычніка, а таксама ў часе белапольскай акупацыі адна нацыянальнасьць натраўлівалася па другую. А цяпер, дзякуючы правільнай ленінскай нацпалітыкі, злучаны ў адзін магутны калектыў усе працоўныя нашай краіны.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі мы дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў. Але кожны працоўны павінен цьвёрда памятаць, што мы ніколі ня мелі-б такіх дасягненьняў без магутнай дапамогі ўсяго Савецкага Саюзу. Толькі ў цесным саюзе з усім СССР мы змаглі дасягнуць такіх посьпехаў.

Яшчэ-ж надаўна саха і барана папавалі на нашых палёх. А сёньня вы тут пабачыце ня толькі машыны, якія сьведчаць аб посьпехах нашай індустрыі, але і экспанаты сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, пераходзячай на больш высокую тэхніку. Вы відавочна ўлэўніцеся, што толькі сацыялістычны сэктар — шлях да перамогі над жабрацтвам і бяскультур'ем у індывідуальнай бядняцкай і серадняцкай гаспадарках.

Мы ў гэтым годзе маем пад калгасамі 15 проц. пасеўнай плошчы і гэтыя калгасы, — вялікі агітатар за далейшую калектывізацыю, бо яны дасягнулі значна больших посьпехаў, чым індывідуальнікі.

Мы павінны памятаць, што мы маем яшчэ ў сваім асяродку ныцікаў і малавераў, якім патрэбна даць самы жорсткі адпор, каб пасьпяхова будаваць сацыялізм. У БССР засталася невялікая група вярхушачнай контррэвалюцыйнай інтэлігенцыі, якая паставіла сабе мэтай змагацца з дыктатурай пралетарыяту. У яе руках усе сродкі барацьбы аказаліся добрымі, абы яны адпавядалі адпэй мэце — садзейнічаць ваеннаму нападу на Савецкую Беларусь, абы забясьпечыць дапамогу інтэрвэнтам.

На вялікі жаль, трэба адзначыць, што аказаліся асобныя члены партыі, якія прапавалі на ўказы гэтых контр - рэвалюцыянэраў.

Нельга думаць, што і ў далейшым мы ня будзем мець захадаў узарваць з сярэдзіны наша будаўніцтва. Але мы моцны і ў любы момант усякім контр - рэвалюцыйным захадам дадзім рашучы бальшавіцкі адпор.

З кулаком барацьба яшчэ далёка ня скончана. Кулак працівіцца ўсімі сіламі і ў далейшым будзе працівіцца ўсім мерапрыемствам пераможнанаступаючага сацыялізму. Каб перамагчы мы павінны весьці бязьлітасную барацьбу з усімі тымі ў нашых радох, хто хістаецца, хто замінае нам ісьці па ленінскім шляху. Мы самым жорсткім і бязьлітасным чынам ударым па тых, хто імкнецца стаць на нашым шляху, мы давядзем да канца ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, мы выкарчуем карэньні капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне.

Выстаўка — гэта першая спроба паказаць, што зроблена для пабудовы сацыялізму ў адным з рэспублік СССР —Беларусі. Мы маем вялізарнае разьвіцьцё творчых сіл працоўных пасьля вялікага Кастрычніка, і ў гэтым сьмерць капіталізму. Мы сваёй работай прыбліжаем перамогу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Тав. **Хацкевіч** вітаў прысутных ад імя Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

— На абшарах Беларусі 10 год таму назад красаваліся руіны, пакінутыя нам у спадчыну шматлікімі акупантамі. Дзякуючы вялізарнай напружанасьці сіл рабочае клясы ў саюзе з бядняцка - серадняцкімі коламі сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі мы маем сёньня вялізарнейшыя дасягненьні ў прамысловасьці і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі.

Гэтыя дасягненьні былі магчымы толькі пры ўмове шчыльнага саюзу з працоўнымі братэрскіх рэспублік, пры іх актыўнай дапамозе.

Ад імя СНК БССР з прывітальнай прамовай выступіў тав. **Бенэк.**

— Першыя два гады пяцігодкі вялікіх работ пераконваюць у тым, што нашы перамогі вялізарны, што наш курс правільны.

Трэба змагацца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Прыліў у калгасы ў часе ўборачнай кампаніі — залог нашых далейшых посьпехаў у справе суцэльнай калектывізацыі.

— Змагайцеся з закасанымі рукавамі за прамфінплян, — зьвярнуўся з заклікам старшыня ЦСПСБ тав. **Рыжоў:** нашы дасягненьні — надта вялікія, але наперадзе яшчэ шмат працы.

Папярэдадні V кангрэсу Прафінтэрну згуртуемся мацней вакол камуністычнай партыі, будзем узорам і прыкладам у барацьбе за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва!

— Пралетарская рэвалюцыя—гаворыць у сваім выступленьні тав. **Ягораў** — вызваліла творчыя сілы рабочых і працоўнага сялянства нашай краіны. Сёньня мы дэманструем дасягненьні гэтых сіл, пералітыя ў экспанаты першай Усебеларускай выстаўкі. Але трэба памятаць, што ворагі ня дрэмлюць. Яны рыхтуюцца ўвесь час да нападу на першую ў сьвеце краіну дыктатуры пралетарыяту.

Ад імя байцоў камандзіраў і палітработнікаў БВА запэўніваю вас, што палітычна - маральны стан Чырвонай арміі высокі, што яна заўсёды гатова даць адпор усякаму замаху на спакой савецкіх межаў.

Мы вайны ня хочам, але заваёў Кастрычніка не здамо нікому!

Пасьля прамовы тав. Ягорава, якая перарывалася ў шмат якіх мясцох дружнымі воплескамі прысутных, выступіў сакратар менскага акругкому КП(б)Б тав. **Тамашэўскі,** рабочы мэталісты тав. **Няроўскі** і селянін-калгасьнік з Гомельшчыны тав. **Карпенка.**

— Вы ля варштатаў, а мы ля плугу, — сказаў тав. Карпенка, — мы ўсе, як адзін змагаемся за перамогу сацыялізму. Няхай жыве камуністычная партыя — адзіны кіраўнік і арганізатар нашага пераможнага будаўніцтва!

Пасьля ўрачыстай часткі пачаўся агляд павільёнаў выстаўкі.

Ю. Л. і Я. С.

Член нямецкай рабочай дэлегацыі тав. ВУНДШ

Прыезд нямецкіх дэлегатаў

Учора а 10 гадз. раніцы з Масквы прыехалі ў Менск два прадстаўнікі нямецкай камуністычнай рабочай дэлегацыі, якая атрымала прэмію — паездку ў СССР за актыўную мопраўскую работу.

Рабочыя Менску горача спаткалі нямецкіх гасьцей. На мітынгу, які адбыўся на вакзале, прыехаўшых дэлегатаў вітаў старшыня МОПР'у БССР т. **Калмын.** З адказным словам выступіў адзін з дэлегатаў — рабочы мэталіст т. Штудгарта, які перадаў прывітаньне працоўным Менску ад рабочых Нямеччыны.

Учора дэлегаты прысутнічалі на ўрачыстым адчыненьні Ўсебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Член нямецкай рабочай дэлегацыі тав. РЭМЕР

Падрыхтоўка да V кангрэсу Прафінтэрну

Набліжаецца 15 жніўня—дзень адчыненьня V кангрэсу Прафінтэрну. **Рэвалюцыйныя рабочыя ўсяго сьвету ўзмоцнена рыхтуюцца да яго пад лёзунгамі самакрытыкі, сацыялістычнага спаборніцтва і бязьлітаснай барацьбы з правым апартунізмам і «левым» сэктанцтвам.** Прыклад рабочых СССР, якія карыстаюцца вострай зброяй самакрытыкі і сацыялістычным спаборніцтвам для пераможнага будаўніцтва сацыялізму, знайшоў шырокі водгук сярод працоўных мас самых далёкіх куткоў сьвету. Шматлікія канфэрэнцыі і зьезды рабочых пад кіраўніцтвам рэвалюцыйных прафсаюзаў крытыкуюць праробленую работу па арганізацыі працоўных мас для барацьбы з капіталам. Рабочыя розных арганізацый і краін **абвяшчаюць рэвалюцыйнае спаборніцтва на лепшую работу сярод шырокіх мас працоўных.** Упершыню за 10 год існаваньня Чырвонага Прафінтэрну падрыхтоўка да яго чарговага V кангрэсу носіць такі выключна масавы характар. Гэта **падрыхтоўка ідзе не ў прафсаюзных вярхох, а ў самай гушчы рабочых фабрык, заводаў і сярод беспрацоўных.**

У Англіі ў працягу апошняга месяца адбыўся **рад канфэрэнцый, арганізаваных рухам меншасьці** ў Лёндане, у Баўтонс, Кардыфы, Глазко і інш. гарадох. На гэтых канфэрэнцыях прысутнічалі шматлікія дэлегаты ад фабрык, заводаў, капальняў і ад беспрацоўных.

У **склад дэлегатоў,** абраных на V кангрэс Прафінтэрну, ўвайшлі рабочыя ад варштату і беспрацоўныя амаль усіх галін прамысловасьці.

Аб масавым характары падрыхтоўкі сьведчаць рабочыя канфэрэнцыі, праведзеныя ў **Францыі.** У Адэ (цэнтральны горнапрамысловы раён дэпартаменту Гаар) на абласной рабочай канфэрэнцыі прымала ўдзел **3 тыс. рабочых.** у Мазэльскім раёне і Нансі на двух сходах прымала ўдзел 5 тысяч рабочых.

Унітарныя прафсаюзы Нансі выказалі рабочых Ліона па сацспаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы V кангрэсу.

У Лілі адбыўся 10-тысячны мітынг рабочых, скліканы ўнітарнымі прафсаюзамі. На гэтым мітынгу былі сьцьвярджаны дэлегаты на V кангрэс Прафінтэрну, выбраныя рабочымі поўначы Францыі. Мітынгу папярэджвала магутная дэманстрацыя рабочых. Разумеючы ўсю важнасьць удзелу рабочых на кангрэсе, **французкія рабочыя ўзмоцнена зьбіраюць сродкі для пасылкі туды сваіх дэлегатаў.**

Пільна рыхтуецца да надыходзячага кангрэсу Прафінтэрну **і рэвалюцыйная прафапазыцыя Нямеччыны.** Па ўсёй краіне праводзяцца **рабочыя канфэрэнцыі і сходы,** якія ўсебакова абгаварваюць парадак дня надыходзячага кангрэсу. Цэнтрам увагі рабочых, работніц і служачых, якія актыўна выступаюць на канфэрэнцыях і сходах, служаць пытаньні **аб тактыцы і стратэгіі рэвалюцыйнай прафапазыцыі ў барацьбе супроць наступаючага капіталу.** Рэвалюцыі, ухваленыя імі па гэтых пытаньнях, прадстаўляюць каштоўны матар'ял для V кангрэсу.

У Бэрліне гэтымі днямі адбылася **другая канфэрэнцыя рэвалюцыйнай прафапазыцыі Бэрлін-Брандэнбурскага і інш. раёнаў.** Ёй папярэджвала вялікая падрыхтоўчая работа. Праведзены сходы па прадпрыемствах, як сярод рабочых чырвоных прафсаюзаў, так і рэфармісцкіх і сярод беспрацоўных. Гэтыя нізавыя сходы ня толькі выбралі дэлегатаў на бэрлінскую канфэрэнцыю і V кангрэс Прафінтэрну, але ўважліва абгаварылі пытаньні аб міжнародным становішчы і крызісе нямецкай прамысловасьці. У сувязі з гэтым, вялікая ўвага была зьвернута на адзіны пралетарскі фронт.

Другая бэрлінская канфэрэнцыя слушыць выразным довадам таго, што **рэвалюцыйная прафапазыцыя зьяўляецца арганізатарам шырокіх мас безпартыйных рабочых.** На канфэрэнцыі былі прадстаўлены 242 прадпрыемствы, на якіх працуе 120 тыс. рабочых. Большасьць лавіны дэлегатаў гэтай канфэрэнцыі беспартыйныя рабочыя: з 548 дэлегатаў 263 беспартыйныя, 5 с.-д. і 280 члены партыі. Сярод дэлегатаў 113 беспрацоўных. Масавы характар гэтай канфэрэнцыі падкрэсьліваецца тым, што болшасьць дэлегатаў была абрана не прафсаюзнымі вярхамі, а на саміх прадпрыемствах: 368 дэлегатаў былі абраны фабрычна-заводзкімі сходамі рабочых, 63 на цэхавых сходах і толькі 82 дэлегаты—прафсаюзнымі сходамі.

У пастановах, якія ўхвалены гэтай канфэрэнцыяй, асабліва ўвагі заслугоўвае **пастанова аб палітыка-выхаваўчай рабоце сярод батракоў, работніц і моладзі.** Абвешчана сацыялістычнае спаборніцтва ў правядзеньні справаздачнай кампаніі аб канфэрэнцыі на прадпрыемствах і біржах працы і таксама аб арганізацыі **чырвоных выбарчых камісій і груп рэвалюцыйнай прафапазыцыі на прадпрыемствах.** Канфэрэнцыя выбрала 5 дэлегатаў на V кангрэс Прафінтэрну.

Лацінская Амэрыка пасылае на V кангрэс 60 дэлегатаў, сярод іх прадстаўнікі рабочых розных галін прамысловасьці Аргенціны, Уругвая і Бразіліі. Дэлегаты выбраны на зьездах і канфэрэнцыях мясцовых рабочых арганізацый.

У **Нарвэгіі** падрыхтоўка да V кангрэсу пачалася нарвэскай канфэрэнцыяй рэвалюцыйнай прафапазыцыі. **Канфэрэнцыя ўхваліла стратэгію і тактыку новай забастовачнай барацьбы, выпрацаваную Прафінтэрнам.** Яна ўважліва разгледзела ўсе намыслкі, дапушчаныя ў рабоце па падрыхтоўцы і арганізацыі штодзённай барацьбы рабочых. Канфэрэнцыя прызнала асноўным сродкам барацьбы мабілізацыю шырокіх мас рабочых. **Пад гэтым лёзунгам ў Нарвегіі праводзіцца ўся работа па падрыхтоўцы V кангрэсу.**

У **Бэльгіі** з жніўня адбылася першая канфэрэнцыя рэвалюцыйнай прафапазыцыі. У ёй прымала ўдзел 180 дэлегатаў рабочых розных галін прамысловасьці.

Не адстаюць ад сваіх заходніх братоў **і ўсходнія краіны. Манголія** абрала дэлегатам на V кангрэс Прафінтэрну старшыню усеманголькае рады прафсаюзаў Лхубу. Кітайскія рабочыя ў Манголіі таксама дэлегуюць свайго прадстаўніка.

У горадзе Цэцэрліку, у Манголіі адбылася канфэрэнцыя батракоў. Яны таксама пасылаюць на V кангрэс свайго прадстаўніка.

Далёка ня з усіх краін яшчэ паступілі весткі аб падрыхтоўцы рэвалюцыйных рабочых і сялян да V кангрэсу Чырвонага Інтэрнацыяналу прафсаюзаў. Але ўжо цяпер даныя гавораць аб тым, **як актыўна шырокія масы працоўных усяго сьвету рыхтуюцца да свайго кангрэсу,** каб абмяркоўваць вопытамі і намеціць новыя шляхі для барацьбы **супроць капіталістычнага паду за сацыялізм.**

А. Б.

16 міліярдаў—на ўзбраеньні

Канцэнтрацыя фашысцкіх сіл у Нямеччыне

Антыімпэрыялістычная канфэрэнцыя на нямецка-швэйцарскай мяжы

Імпэрыялістычныя „тэмпы"

БЭРЛІН, 10. У Зінгене на нямецка-швэйцарскай граніцы 3 жніўня адбылася **міжнародная канфэрэнцыя рабочых ваеннай прамысловасьці.** У ганаровы прэзыдыум канфэрэнцыі былі выбраны т. т. **Сталін, Варашылаў, Тэльман і інш.**

У асноўным дакладзе было адзначана, што з году ў год **выдаткі на ўзбраеньне нязвычайна хутка растуць.** У той час, калі ў 1914 годзе налічвалася ўсяго **700 аэраплянаў,** цяпер іх ёсьць ужо **17 тысяч.** Вытворчасьць удушлівых газаў паднялася з **7.000 тон** у 1913 годзе да **7½ млн.** тон у 1929 г., узрыўных рэчаў — з 2 млн. да 6 млн. тон. За апошнія 10 год краіны, якія ўваходзяць у Лігу Нацый затрацілі на ўзбраеньне **16 мільярдаў долараў.** Адна францыя затрацила на ўзбраеньне 7 мільярдаў франкаў, з іх 5 мільярдаў для ўмацаваньня франка-італьянскай граніцы.

Канфэрэнцыя зьвярнулася з адозвай да рабочай клясы, у якой зазначаецца на падрыхтоўку імпэрыялістычных краін да інтэрвэнцыі супроць СССР. Адозва заклікае рабочых да арганізацыі на прадпрыемствах баявых камітэтаў для кіраўніцтва барацьбой супроць наступаючай буржуазіі.

Новы фашысцкі цэнтр

БЭРЛІН, 10. Зьліцьцё дэмакратычнай партыі Нямеччыны і часьці народнай партыі з баявой фашысцкай арганізацыяй «Младо-Нямецкі Ордэн» і ператварэньне ў новую дзяржаўную партыю, якая зьяўляецца выразным праяўленьнем фашызацыі нямецкай буржуазіі, адбыліся **па камандзе кіраўнікоў прамысловых груп, якія фінансуюць гэтыя арганізацыі.**

«Младо-Нямецкі Ордэн» знаходзіцца з даўняга часу ў цеснай фінансавай сувязі з калійным прамысловцам Арнольдам Рэйхсбэргам, добра вядомым па сваёй сыстэматычнай прапагандзе **адзінага фронту эўрапейскіх дзяржаў для вайны супроць СССР.** Гэту-ж арганізацыю фінансуе адзін з кіраўнікоў буйнейшага хэмічнага трэсту «І. Г. Фарбэніндустры» — Бош. Прамысловца Герман Рэхлін, правадыр новай «дзяржаўнай партыі» у Саарскай вобласьці, стаіць на чале заводу, які вырабляе бранявую сталь. **Гаспадаром новай партыі зьяўляецца такім чынам група прадпрыемцаў хэмічнай і вайсковай прамысловасьці з акрэсьленай антысавецкай арыентацыяй.**

Ваянізацыя жанчын у Югаславіі

ВЕНА, 10. Вайсковае абучэньне дзяўчынак пачынаецца ўжо ў народнай школе. Гімнастычныя практыкаваньні адпавядаюць праграме фашысцкага саюзу «Сокал Югаславускага каралеўства». Паводле выданнага ваеннай дыктатурай школьнага закону, гімнастыка ў школах выкладаецца афіцэрамі. Школьніцы вывучаюцца ў асобных жаночых групах «Чырвонага Крыжу», у якіх іх выхоўваюць у «каханьні да караля і бацькаўшчыны», вывучаюць да падачы першай дапамогі і правядзеньню палявых тэлефонаў. Далейшае свае вайсковае выхаваньне жанчыны атрымліваюць ў «Сокале», на чале якога стаіць наступнік прастолу. Ваенны міністар назначае настаўніцу для загадваньня жалочым аддзелам «Сокал». Праўленьне «Сокала» складзенае ваенным міністрам, назначае кіраўніц на мясцох. Ва ўсіх жаночых аддзелах «Сокала» афіцэры абучаюць фэхтаваньню і абыходжаньню са зброяй. Тут-жа іх знаёмяць з ваеннай санітарыяй.

Увесь гэты будынак ваеннага абучэньня жанчын канчаецца арганізацыяй груп жаночых стралкоў у складзе ваенных гарнізонаў. **Сацыял-фашыстыя ня толькі ня змагаюцца супроць абарачэньня жанчын у ваенную прыладу фашысцкай дыктатуры, але ўселяк падтрымліваюць ваенізацыю жанчын.**

Толькі **камуністычная партыя растлумачвае шырокім масам сапраўдны характар ваеннага абучэньня.** Штогодна ў міжнародны жаночы дзень выдаецца спэцыяльны лісток,

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Работу сярод батрацтва і беднаты на вышэйшую ступень

Партыйныя арганізацыі калгасаў павінны забясьпечыць такую пастаноўку работы груп беднаты, каб яны ня толькі абаранялі непасрэдныя інтарэсы беднаты, але і садзейнічалі ўмацаваньню саюзу рабочае клясы і вясковай беднаты з серадняками"

(З пастановы XVI зьезду ВсесаКП(б).

На перадавыя пазыцыі

Ґашучае і бязьлітаснае наступленьне капіталістычныя элементы гораі вёскі зьяўляюцца аднэй з рашаых прычын нашых посьпехаў у гае сацыялістычнага будаўніцтва. Напленьне на кулацтва зьяўляецца эй з асноўных прычын, якія заьпечылі круты паварот бядняцкіх і адняцкіх мас сялянства да сацыізму.

Іашы посьпехі пры хлебазагатоўках інулым годзе і ў галіне калектывізаі былі-б немагчымы, калі-б партыя разгарнула гіганцкай работы па пачнай ізаляцыі і зьнішчэньні налічнага і эканамічнага ўплыву на беду і сераднякоў кулацкіх элемэнтаў кі.

Этым посьпехам мы абавязаны вяай рабоце, праведзенай усімі парнымі і савецка-каапэрацыйнымі арнізацыямі на самастойнай арганізаі і рабоце сярод беднаты.

Работа сярод беднаты дала нам магмасьць на аснове саюзу пралетарыі беднаты з серадняком дабіцца пелому ў галіне сацыялістычнай рэструкцыі сельскай гаспадаркі. актыка праведзеных мерапрыемаў па ліквідацыі кулацтва як клі на аснове суцэльнай калектывізаі таксама нас пераконвае, што там, работа па арганізацыі беднаты стана патрэбнай выпышні, гэтыя меры мероемствы прайшлі з найбольшым ьпехам. **Пытаньне аб рабоце з бедной, аб самастойнай яе арганізацыі сельсаветах, каапэрацыі, ніжэйх зьвеньнях калгаснага руху ўсё ч стаіць вельмі востра і зьяўляецаднэй з асноўных задач нашай рапы на вёсцы.**

посьпехам правесьці ўборачную панію ў калгасна-саўгасным і ў дняцка-серадняцкім індывідуальм сэктарах, забясьпечыць свячае паступленьне сельска-гаспадара падатку і выкананьне плянаў ба і іншых загатовак, разьмясьпо пазыку «Пяцігодка—за чатыры ы», рэалізаваць калгасныя імкненьзначнай часткі беднякоў і серадняужо ў асенняю пасеўную кампанію і выканаць на ўсе 100 проц. заьне на пасеўнай кампаніі і жывёадоўлі можна толькі ў тым выпадкалі мы здолеем ва ўсёй сваёй раце абапёрцеся на беднякоў калгасаў і некалгасьнікаў.

Усе гэтыя задачы могуць быць выаны толькі пры ўмове разгорнутага паступленьня на кулацтва, а гэта тупленьне магчыма толькі пры ліі арганізацыі беднаты і пры яе акным удзеле ў правядзеньні ўсіх ых задач. Вялікае значэньне беднаі ў галіне правядзеньня мерапрытваў па ўмацаваньні раёнаў, як лавых пунктаў сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы і асабліва сельсаветаў. Нельга ўмацаваць сельсаветы і раёны без умацаваньня клясавай арганізаванасьці беднаты.

Трэба канстатаваць, наяўнасьць раду моментаў недаацэнкі работы з беднатой, як па-за калгасамі, так і ўнутры калгасаў. Наша партыя дала строгую дырэктыву **нападзіць правільныя ўзаемаадносіны паміж калгаснікамі і некалгаснікамі.** Замест гэтага, у радзе месц да гэтага часу маем зусім нецярпімае далей становішча, калі няма правільных узаемаадносін паміж калгаснікамі з аднаго боку, беднатой і сераднякамі, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгас, з другога боку. Нельга ўстанавіць правільных узаемаадносін калгаснікаў з беднякамі і сераднякамі некалгаснікамі, не разгарнуўшы як сьлед работы сярод беднаты. У некаторых мясцох ідзе змаганьне калгаснікаў з паасобнымі групамі беднаты ці паасобнымі беднякамі. Некаторыя з прычыны гэтага ня хочуць бачыць, ігнаруюць клясавую неаднароднасьць тых, хто выступае супроць калгасу. Замест таго, каб прыцягнуць на свой бок у першую чаргу калгасную беднату, адкідаць яе іншы раз у лягер варожых калгасу элемэнтаў ці па меншай мере ня робіць нічога для таго, каб ператварыць «пасыўныя» элементы беднаты ў гарачых ініцыятараў і саюзьнікаў калгасу. Калгасная беднота робіць вельмі мала, ці нічога ня робіць для таго, каб дапамагчы кіраўніцтву некалгаснай беднатой.

Усім тым, хто бывае на вёсцы, кідаецца ў вочы наяўнасьць значнага пласту і беднякоў і сераднякоў, якія ўжо парашылі ня весьці індывідуальнае гаспадаркі, але яшчэ не адважваюцца ўступіць у калгас. Зусім зразумела, што нам трэба **больш актыўна працаваць** на прыцягненьні ў калгас у першую чаргу беднякоў «каля калгаснікаў», якія павядуць за сабою ў калгас і серадняка.

Усё гэта абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі **зараз-жа ўзяцца за ўзмоцненае выкананьне пастановы XVI зьезду партыі аб умацаваньні самастойнай арганізацыі беднаты ў савецкіх, каапэрацыйных і ніжэйшых зьвеньнях калгаснага руху і разгортваньні работы па мабілізацыі беднаты вакол ўсіх чарговых задач партыі на вёсцы.**

Ва ўсёй нашай рабоце на вёсцы мы павінны выходзіць з таго, што сапраўдный і моцнай апорай улады на вёсцы зьяўляюцца калгаснікі і што беднота па-за калгасам застаецца нашай апорай у па-за калгасным сэктары нашай вёскі і што беднота ўнутры калгасу зьяўляецца адным з асноўных кіраўнікоў калгасаў з абавязковым прыцягненьнем серадняка--калгасьніка да кіраўніцтва ў калгасах. Усе нашы партыйныя арганізацыі павінны яшчэ раз праверыць, як праводзіцца дырэктыва аб самастойнай арганізацыі беднаты, аб групах беднаты, пры сельсаветах, каапэрацыі і ніжэйшых зьвеньнях калгаснай сыстэмы, бязьлітасна вытручваючы ўсе адзнакі недаацэнкі ролі беднаты па-за калгасамі і ўнутры калгасаў, якія зьяўляюцца адным з горшых праяўленьняў правага апартунізму.

Трэба забясьпечыць **актыўны ўдзел беднаты** ў правядзеньні ўсіх нашых задач на вёсцы, трэба прыцягнуць кожнага бедняка да актыўнага ўдзелу ў выраішэньні ўсіх задач, што стаяць перад ім на вёсцы. Бедняк павінен быць мабілізаваны на змаганьне з кулаччом, на змаганьне за 100 проц. выкананьне загатовак хлеба і іншых прадуктаў сельска-гаспадарчага сырцу, бедняк павінен дапамагчы разьмясьціць пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» і сабраць да вызначанага тэрміну с.-г. падатак. Бедняк павінен дапамагчы падрыхтавацца і правесьці ўборачную і пасеўную кампаніі.

Трэба зараз-жа арганізаваць таварыства калгаснікаў з некалгаснай беднатой. Павінна быць разгорнута работа па прыцягненьні ў калгас ўсёй некалгаснай беднаты. **Уся некалгасная беднота — у калгас** — такава задача бліжэйшага пэрыяду работы.

У галіне работы сярод калгасьнікаў з беднатой перад намі стаіць задача дабіцца ўмацаваньня работы з беднатой не абавязкова арганізоўваючы іх у самастойную арганізацыю. Гэта не галоўнае, галоўнае ў тым, каб забясьпечыць беднае кіраўнічую ролю ў калгасе пры абавязковым прыцягненьні серадняку да актыўнага ўдзелу ў кіраўніцтве калгасаў, галоўнае заключаецца яшчэ і ў тым, каб дабіцца накіраваньня энэргіі беднаты на далейшае разгортваньне і рост калгаснага руху і існуючых калгасаў.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў па мабілізацыі і арганізацыі беднаты павінна быць папулярызацыя пастановы XVI зьезду партыі. На гэту задачу трэба зьвярнуць больш, чым дагэтуль, увагі. Кожны раённы партыйны камітэт, кожная ячэйка павінны дабіцца таго, **каб кожны бядняк ведаў пастановы XVI зьезду партыі.** Трэба таксама забясьпечыць сыстэматычны кантроль усіх партарганізацый над выкананьнем пастановы 16 зьезду партыі аб рабоце з беднатой і, ў прыватнасьці, аб вярбоўцы ў партыю беднякоў калгасьнікаў.

Разгортваючы змаганьне з праяўленьнямі правага ўхілу, як галоўнай небясьпекай і рэшткаю трацкізму ў пытаньнях работы з беднатой, партыя забясьпечыць новыя магутныя рэзэрвы з беднаты для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

А. ТАНХІЛЕВІЧ.

Уразрэз з партыйнымі дырэктывамі

«Калгас «Шлях Камуны» (Копыскі раён) арганізаваўся ў 1929 годзе. Партыйная ячэйка пры яго арганізацыі дапусьціла злачынны недагляд. У калгас пралезла шмат кулакоў. Адзін «калгасьнік» з кулакоў плаціў 400 рублёў падатку, а каля 4-х плацілі па 200 руб. кожны.

Затое шмат беднаты і серадняковаў апынуліся па-за калгасам. Усяго ў калгасе «Шлях Камуны» лічыцца 24 гаспадаркі, а бядняцкіх сярод іх толькі 2 гаспадаркі і 5 батрацкіх.

У праўленьне калгасу абраны адны толькі камуністыя: старшыня сельсавету, сакратар парт'ячэйкі і г.д. Фармальна як быццам усё ідзе добра, а па сутнасьці **калгасам кіруе не праўленьне, а былыя кулакі.** Батракі і беднота ў калгасе ў загоне. Кулакі, якія пралезьлі ў калгас імкнуцца зараз адпомсьціць беднаце, за тое, што іх раскулачылі.

Узаемаадносіны калгасу з вакольнай беднатой і сераднякамі, якія засталіся па-за калгасам, надзвычай дрэнныя. У калгасе ёсьць лішкі работчай і цягавай сілы. І калі трэба было дапамагчы суседняму калгасу «Ясны Паранкавец» у палявых работах, дык калгас «Шлях Камуны» ад гэтага адмовіўся. Пра дапамогу-ж беднякам - індывідуальнікам і гаварыць ня варта. Між тым, у калгасе каля 6-8 коняй штодзённа стаяць без работы.

Калгас «Ясны Паранкавец», які складаецца амаль выключна з беднякоў, адчувае вялікую патрэбу ў будынках для жывёлы. А ў калгасе «Шлях Камуны» шмат будынкаў пустае.

Выходзіць усё ўразрэз, наперакор партыйным дырэктывам. Замест таго, каб арганізаваць беднату вакол задач партыі па замацаваньні калгасаў, вакол пытаньня ўзмацненьня ўплыву калгасу на беднякоў і серадняковаў, якія засталіся па-за калгасам, у калгасе «Шлях Камуны» усё больш абвастраюцца ўзаемаадносіны калгасьнікаў з беднякамі і сераднякамі індывідуальнікамі. Партыйная ячэйка, якая абслугоўвае калгас, не рэагуе на ўсе гэтыя факты грубога скажэньня партыйных дырэктыў. Райком партыі павінен неадкладна высьвятліць гэтую справу і ўдарыць на кіраўніках калгасу «Ленінскі Шлях», падпаўшых пад уплыў кулацтва, якое пралезла ў калгас.

Ф.

НА БАЯВЫМ ХАДУ

Работа сярод батрацтва і беднаты— нейшы вучастак работы партыйных анізацый. Гэта зразумелі ня ўсе парныя ячэйкі, якія працуюць на вёс. Аднак было-б груба памылкова дуць аб тым, што работа сярод беднане вядзецца. Абсалютнае больсьць партыйных арганізацый работсярод беднаты паставіла на цэнльнае месца ў агульнай сыстэме свае оты па выкананьні задач партыі на цы. Аб гэтым выразна сьведчыць фактаў.

Чырвонаборскім сельсавеце (Расьскі раён) дзякуючы таму, што работсярод батрацтва і беднаты пастаўта на адпаведную вышыню, у справе ектывізацыі набыты вялікія посьпехі гледзячы на тое, што кулацтва о шалёную агітацыю супроць калгас, за зрыў палявых работ у калгасах. абліва вялікую ролю адыграла батцтва і беднота, арганізаваныя ў група замацаваньні калгасу «Чырвоная амога». Тут у гэтым калгасе адразу ні правільна наладжаны ўзаемааднось паміж батракамі і беднякамі з адо боку і сераднякамі калгаснікамі— другога. Сераднякі былі прыцягнуты работы на кіраўніцтве калгасам.

Або ўзяць хаця-б калгас **«Расьсьветаможца».** Гэты калгас сваімі посьпехамі ў гаспадарчым разьвіцьці абавязан галоўным чынам партыйнай ячэйцы, якая добра наладзіла работу батрацка-бядняцкай групы і прыцягнула серадняка да работы на кіраўніцтве калгасам. Батрацка-бядняцкая група данага калгасу зьяўляецца ініцыятарам у разгортваньні сацпаборніцтва і ўдарніцтва, абмяркоўвае важнейшыя гаспадарчыя пытаньні з жыцьця калгасу. На агульных сходы батрацка-бядняцкай групы прыходзяць батракі, бедняки і некалгаснікі.

Ня дрэнна вядзе работу і батрацка-бядняцкая група **ў калгасе «Шчадрын»,** (Парыцкі раён). Гэты буйнейшы калгас у раёне арганізаваны ў пачатку бягучага году і здолеў палітычна і гаспадарча ўмацавацца. Ён умацаваўся толькі дзякуючы таму, што вакол задачы па будаўніцтве калгасаў партыйная арганізацыя згуртавала шырокія колы батрацка-бядняцкіх мас, што на аснове разгортваньня работы сярод батрацтва і беднаты былі правільна наладжаны ўзаемаадносіны з серадняком.

Гэтыя ўзоры сапраўды бальшавіцкае работы партячэек сярод беднаты павінны быць перанесены на ўсе вясковыя партыйныя ячэйкі.

Е. С.

Батракоў адштурхоўваюць ад партыі

(Крайская ячэйка КП(б)Б, Плешчаніцкі раён)

XVI зьезд УсесаКП(б) даў зусім ясную дырэктыву аб усямерным узмацненьні работы сярод беднаты. Аднак, рад партыйных ячэек не прыступіў да ажыцьцяўленьня гэтай дырэктывы. Для прыкладу ўзяць хоць-бы Крайскую ячэйку КП(б)Б.

Яна зусім нічога ня робіць па ўзмацненьні работы сярод батрацтва і беднаты як у калгасах, так і сярод тых, хто застаўся яшчэ па-за калгасам. Батрацтва і беднота не прыцягнуты да кіраўнічай работы ў калгасе (калгас «Чырвоная Беларусь»), якія ня ўзьнята, не згуртавана для змаганьня з усякімі хворымі зьявішчамі, якія маюць месца ў калгасе.

І горш таго, у ячэйку падалі заявы аб уступленьні ў партыю 5 батракоў і 2 батрачкі. Гэтыя заявы ўжо **больш за поўгада валяюцца** ў ячэйцы не разглядженымі. Аб выхаваўчай рабоце сярод батрацтва і беднаты няма і ўспаміну, ячэйка забылася пра свае непасрэдныя задачы—вэрбаваць у рады партыі батракоў і тых калгаснікаў з беднаты, якія праявілі сябе на фронце змаганьня за сацыялістычную вёску.

Эмскі Р.

Ігнаруюць беднату

У калгасах **Жыткавіцкага раёну** (Мазыршчына) ніякай работы з беднатой партячэйкі не вядуць. У калгасе «Баравая» камуністыя кажуць: усе роўныя, а таму і ня трэба весьці работы з беднатой.

У калгасе «Новае Жыцьцё» Людзенікага сельсавету, у праўленьне пралез падкулачнік Гарбуз, у члены рэвкамісіі —падкулачнік Буякоў. Гэтыя падкулачнікі павялі так работу, што некалькі батракоў вышлі з калгасу. Беднота ў калгасе загнана.

У калгасе «1-га Жніўня» у фонд каапэраваньня беднаты і авансы на зарплату не скарыстоўваюцца. Партыйная ячэйка на гэта не рэагуе.

Раённы камітэт партыі толькі зараз пачаў выпраўляць недахопы ў рабоце з беднатой.

Партыец.

НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ ЗРЫВУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

Менш нэрвовасьці, больш справы

У канцы ліпеня мес. г.г. рэдакцыя газэты «Зьвязда» склікала нараду па падрыхтоўцы да новага навучальнага году, на якой выступаўшы ад імя ВСНГ тав. **Дружалоўскі** казаў, што няма да гэтага часу гаспадара ў нова-адчыненым Аўта-трактарным тэхнікуме ў Гомелі. У «Зьвязьдзе» за 4 жніўня зьмешчаны артыкул таксама прадстаўніка ВСНГ тав. **Куніцы,** з якога мы можам убачыць, што справа падрыхтоўкі кадраў стаіць пад пагрозай зрыву. Прыняўшы навучальныя ўстановы, гаспадарчыя арганізацыі, як быццам, ня могуць справіцца з арганізацыяй і кіраўніцтвам гэтых устаноў, чаму, зразумелая рэч, ніхто паверыць ня можа, бо мы маем досыць вялікую практыку па іншых рэспубліках, якая сябе апраўдала. Гэтым вызвана пастанова Лістападаўскага пленуму ЦК УсесаКП(б) аб далейшай перадачы адпаведным гаспадарчым арганізацыям навучальных устаноў.

У нас у БССР, намойму, абсалютна няма аб'ектыўных прычын, якія-б не давалі магчымасьці пасьпяхова кіраваць і арганізоўваць навучальныя ўстановы гаспадарчымі арганізацыямі, а ёсьць, па маёй глыбокай перакананасьці, прычыны выключна суб'ектыўныя, выключна пэрсанальныя якасьці людзей, якім даручана гэтая справа. У гэтым мы можам упаўніцца хоць-бы і таму, што, апрача працаўнікоў ВСНГ, ні адна іншая гаспадрачая арганізацыя, якім перададзены навучальныя ўстановы, ня скардзіцца ні на НКА, ні на свой лёс.

Перш чым асьвятліць сапраўднае становішча з падрыхтоўкаю да будучага навучальнага году, прыведу некалькі даведак аб сапраўдным стане перадачы ВНУ і тэхнікумаў гаспадарчым органам, г. зн. на пытаньні закранутым у артыкуле тав. Куніцы.

1. Пастановаю СНК Гомельскі Аўтатрактарны тэхнікум даручана арганізоўваць ВСНГ і таму трэба толькі параіць т.т. з ВСНГ не лямантаваць, а выконваць гэту пастанову, альбо паставіць пытаньне ў СНК, што яны выканаць гэтага ня могуць і просяць перадаць іншаму наркамату.

2. СНК БССР па прапанове камісіі т. Бэнэка ў чэрвені перадаў некаторыя ВНУ і тэхнікумы адпаведным гаспадарчым арганізацыям. Пасьля гэтага адразу-ж была афармлена перадача і на лініі НКА па дагаворанасьці з адпаведнымі гаспадарчымі арганізацыямі. Да гэтага трэба дадаць, што апарат НКА падрыхтаваў і склаў на перададзеныя ўстановы ня толькі навучальныя пляны і праграмы, а нават штаты і кашторыс, так што ніякіх, намойму, цяжкасьцяй, нават з гэтага боку не павінна было быць.

3. Што датычыцца Менскага Палітэхнікуму, дык гэтае пытаньне вельмі падрабязна абмяркоўвалася на пасяджэньні СНК і, прымаючы пад увагу: а) што там ёсьць чатыры аддзяленьні па розных галінах народнае гаспадаркі; б) што навучальнае абсталяваньне, лябараторыі, габінэты вельмі яшчэ слабы, ўкамплектаваны і карыстаюцца імі ўсе аддзяленьні, — СНК рашыў пакуль што на гэты год Менскі Палітэхнікум не раз'яднаць на паасобныя тэхнікумы і пакінуць у веданьні НКА.

Гэтае пытаньне, наколькі мне вядома, ніхто да гэтага часу не абскардзіў, таму НКА да таго часу, пакуль ня будзе пастановы СНК, які-б адмяніў ранейшую сваю пастанову, ня можа перадаць нікому Менскага Палітэхнікуму, бо ён (Палітэхнікум) мог-бы апынуцца ў такім-жа стане, як і Гомельскі Аўтатрактарны тэхнікум, г. зн. без гаспадара.

4. Лістападаўскі пленум ЦК УсесаКП(б) пастанавіў, што ўсе новыя індустрыяльныя ВНУ і тэхнікумы павінны арганізоўвацца адпаведнымі гаспадарчымі арганізацыямі. Такім чынам, з боку ВСНГ ня можа быць ні да каго ніякіх прэтэнзій наконт гэтых тэхнікумаў і ВНУ, з старых-жа ў БССР было толькі 2 тэхнікумы — гэта Віцебскі і Менскі і хэміка-тэхналёгічны факультэт БДУ, з якіх ВСНГ перададзены толькі адзін Віцебскі тэхнікум і хэміка-тэхналёгічны факультэт. Для перадачы гэтых 2-х устаноў, намойму, ня трэба асабліва плянаваньня і непатрэбных пасяджэньняў для абмяркаваньня.

Хочацца параіць т. Куніцы азнаёміцца з вопытам прыёму і работы па арганізацыі навучальных устаноў Галоўдортрансам, які за вельмі кароткі час, значна карацейшы, чым было часу ў ВСНГ, шмат чаго зрабіў шчыра, як сьлед, узяўшыся за работу.

На іншыя заўвагі т. Куніцы вельмі цяжка адказаць па той прычыне, што яны пабудаваны на чутках. (Напрыклад, як быццам нехта з былых адказных працаўнікоў НКА нешта такое гаварыў Віцебскаму тэхнікуму і г. д.).

Наконт мэтадаў работы НКА магу толькі сказаць, што апарат НКА, як кіруючы склад, гэтак і наогул адказныя працаўнікі (інспэктары) адноўлен амаль на 100 проц.. таму ёсьць цяпер, магчымы і падалей прабелы ў рабоце. У асноўным-жа работа НКА, па заключэньні РСІ, якая правяла абсьледваньне, значна палепшылася ў сувязі з аднаўленьнем апарату.

Падрыхтоўка да новага навучальнага году

Цяпер трэба спыніцца на падрыхтоўцы да новага навучальнага году. Партыя паставіла, як адну з асноўных праблем сацыялістычнага будаўніцтва,— падрыхтоўку кадраў. Гэтая праблема перад намі ставіць ня толькі падрыхтоўку колькасьці спэцыялістых, але і якасьці падрыхтоўкі. У зьвязку з гэтым мы павінны ў нас у БССР, апрача існуючых навучальных устаноў, арганізаваць і адчыніць шмат новых ВНУ, тэхнікумаў, значна павялічыўшы прыём у старыя навучальныя ўстановы.

Вынікам гэтага — замест агульнага кантынгенту навучаючыхся зараз у вузах, тэхнікумах, рабфіках, ФЗВ і іншых прафтэхнічных навучальных установах каля 20 тыс. чалавек. На будучы год запраектавана і забясьпечана кантарысам прыём каля 44 тыс. чал. Што гэта азначае? Гэта азначае, што мы прымаем у навучальныя ўстановы ў адным толькі гэтым годзе ў 2 разы больш, чымся навучалася ўсяго пры 3-4-гадовым курсе навучаньня, ці — прыём гэтага году студэнтаў і курсантаў павялічваецца ў параўнаньні з леташнім прыёмам у 6-7 разоў. Гэта першае.

Другое. І XV і XVI зьезды УсесаКП(б) рубам паставілі пытаньне аб агульным культурным уздыме працоўных. Як першачарговая вялізарнейшая задача ў гэтым кірунку — гэта ўвядзеньне **ўсеагульнага абавязковага навучаньня для дзяцей 8-10 гад. ўзросту,** пераростаючы ад 11-15 год у гарадох і фабрычна-заводзкіх населішчах на базе 7-годкі і ліквідацыя няпісьменнасьці. У БССР у першай саюзнай рэспубліцы ўведзена **ўсеагульнае абавязковае навучаньне ў леташнім годзе.** Дзякуючы вялізарнейшаму імкненьню працоўных мас да навучаньня сваіх дзяцей і ўвазе гэтай справе з боку шырокай савецкай грамадзкасьці, асабліва асноўнае масы настаўніцтва, мы ў гэтым годзе з дырэктываю ЦК КП(б)Б і ўраду БССР па ўсеагульным навучаньні ў асноўным справіліся (ахоп 8-годак — 91 проц., ахоп усіх дзяцей ва ўзросьце 8-11 год — 86 проц.).

На будучы год мы павінны павялічыць прыём у параўнаньні з леташнім годам па ўсеагульным навучаньні на 55-60 тыс. дзяцей і па ліквідацыі няпісьменнасьці на 200 тыс. чал. (ахоп 1929-30 г. 270 тыс. чал., 1930-31 г. — 470 тыс. чал.), з такім разьлікам, каб у 1930-31 годзе ў асноўным скончыць справу ліквідацыі няпісьменнасьці.

Што трэба зрабіць

Выходзячы з вышэйпаказаных дырэктыў партыі і ўраду і тых кантынгентаў навучаючыхся ў розных прафтэхнічных навучальных установах, школах, і ліквпунктах, якія намечаны, перад усімі дзяржаўнымі і грамадзкімі арганізацыямі і ўсёю савецкаю грамадзкасьцю, стаяць наступныя складныя пытаньні:

1) Забясьпечаньне кантынгенту навучаючыхся **вучэбнаю плошчаю і інтэрнатамі;** гэтае пытаньне найбольш важнае і цяжкае. Прымаючы пад увагу, што абсалютна немагчыма пабудаваць за адзін сэзон капітальных будынкаў, СНК прыняў па прапанове НКА рад пастаноў, якія павінны, пры іх **сумленным** выкананьні, у асноўным забясьпечыць жыльлёвыя патрэбы. Гэтыя пастановы наступныя: а) будаўніцтва баракаў пад інтэрнаты, якое, на вялікі жаль, ня гледзячы на рашучую пастанову СНК, стаіць пад пагрозаю несваячасовага выкананьня па віне будаўнічых арганізацый, якія ўзялі вельмі павольныя тэмпы будаўніцтва і па віне НКПрацы, які не забясьпечвае патрэбнаю рабочаю сілаю будаўніцтва, і па віне гаспадарчых арганізацый, якія ня выконваюць пастановы СНК аб сваячасовай дастаўцы будаўнічых матар'ялаў.

б) Перадача ня менш 50 проц. усіх аслабанёных памяшканьняў у сувязі з ліквідацыяй акруг. Апрача гэтага прапанавана АВК і Гарсаветам клапаціцца аб забесьпячэньні вучэбнаю плошчаю і інтэрнатамі студэнтаў.

Пакуль што гэтыя пастановы таксама ня вельмі **сумленна** выконваюцца месцамі, асобнымі саветамі і выканкомамі.

в) Рацыянальнае скарыстоўваньне тае плошчы, якая ёсьць. На вялікі жаль і тут паміж паасобнымі работнікамі, асабліва БДУ і ВСНГ ідуць пераканаьні, перапіска і г. д., што, зразумелая рэч, не палягчае справы. РСІ ўжо гэтым пытаньнем зацікавілася і, як быццам, справа ўрэгулявана.

2) Пытаньне **навуковых і наогул пэдагагічных кадраў.** Гэтае пытаньне таксама адно з важнейшых. Якое тут становішча і якія ўжыты захады?

а) Навуковымі працаўнікамі ў нас будуць у асноўным забясьпечаны, так званыя, гуманітарныя ВНУ і тэхнікумы (пэдагагічныя, эканамічныя, мэдычныя) шляхам вылучэньня ніавога настаўніцтва на навуковую работу. Лягчэй таксама будзе ўкамплектаваньне сельскагаспадарчых ВНУ і тэхнікумаў. Што датычыцца індустрыяльных ВНУ і тэхнікумаў, дык тут, намойму, найбольш **небясьпечны вучастак,** па-першае таму, што ў нас у БССР амаль няма навуковых працаўнікоў па тэхнічных дысцыплінах і, па-другое — у сувязі з тым, што ў гэтым годзе ідзе пырокае разгортваньне па ўсяму Савецкаму Саюзу індустрыяльных навучальных устаноў, таму адчуваецца значны недахоп навуковых працаўнікоў па ўсяму Савецкаму Саюзу.

Тут трэба клапаціцца аб набыцьці спэцыялістых з іншых саюзных рэспублік, трэба высокаўзвышаць практыкаў-інжынэраў з прамысловасьці, рацыянальна скарыстоўваць тых навуковых працаўнікоў, якія ўжо ёсьць і высоўваць на навуковую работу маладых спэцыялістых.

Апрача паказанага вышэй, значны ўплыў на каплектаваньне навуковымі працаўнікамі ўсіх наогул навучальных устаноў маюць кватэры. Мы ня можам забясьпечыць прыяжджаючых навуковых працаўнікоў кватэрамі. Савет Народных Камісараў прыняў пастанову, каб 10 проц. усіх будуючыхся кватэр, апрача жылкаапэрацыі, браніравалася за навуковымі працаўнікамі. Апрача гэтага і тут гарсаветы павінны больш пайсьці насустрач навучальным установам, чымся было да гэтага часу, асабліва Менскі Гарсавет.

У гэтым годзе мы амаль маглі забясьпечыць пастаўнікамі плян усеагульнага навучаньня, але ў сувязі з самачысткаю радоў настаўнікаў, стварыўся недахоп у 600-650 чал. настаўнікаў для першапачатковае школы. СНК вылучыў патрэбныя сродкі на кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы настаўнікоў. Зараз гэтыя курсы арганізаваны і школы настаўнікамі будуць забясьпечаны.

3) **Аб падручніках і лемантарох:**

а) Падручнікаў для ВНУ і тэхнікумаў у нас вельмі мала, асабліва на беларускай мове, што мае свой адбітак і на беларусізацыі навучальных устаноў. Стаіць задача стварыць аўтарскія кадры для складаньня гэтых падручнікаў, а тыя падручнікі на расійскай і іншых мовах, якія ёсьць, трэба перакладаць на беларускую мову. Складсьці-ж падручнікі за адзін год, тым больш да навучальнага году — абсалютна немагчыма — на гэта патрэбен больш час, і за гэта нашым навуковым працаўніком трэба безадкладна ўзяцца.

б) Што датычыць падручнікаў і лемантароў для масавых школ і ліквбеаў, дык і тут няма чым пахваліцца, бо мусіць чытаў яшчэ памятае рэцэнзіі на якасьць нашых старых падручнікаў. Прыйшлося ўсе падручнікі пераглядзець, шмат з іх аусім забаніць, а ўсе астатнія значна перарабіць. Зараз усе асноўныя падручнікі напісаны аўтарамі і яны друкуюцца. Але мы сустрэліся зноў з перашкодаю, а іменна: друкарні Белдзяржвыдавецтва так дрэна тэхнічна абстаўлены, што калі НКА вызначыў у гатым годзе тыражы 150-300 тыс. экзэмпляраў замест леташніх 25-30 тыс., дык друкарні справіцца не маглі і прышлося СНК выносіць спэцыяльную пастанову аб тым, каб забраніраваць для друкаваньня падручнікаў друкарні большасьці акруговых гарадоў. Гэтыя мерапрыемствы даюць нам упэўненасьць, што падручнікі і лемантары, хоць з некаторым спазьненьнем, будуць выдадзены.

4) **Камплектаваньне ВНУ і тэхнікумаў студэнтамі.** У сувязі з такім павялічэньнем кантынгенту прыёму, аб якім я казаў вышэй, мы апынуліся перад недахопам падрыхтаванага кантынгенту рабочых і працоўных сялян. У працягу гэтага году было арганізавана шмат кароткатэрміновых курсаў для падрыхтоўкі ў ВНУ і тэхнікумы і за кошт бюджэту і за кошт грамадзкіх арганізацый. Ня гледзячы на гэта усё-ж такі недахоп і зараз ёсьць, але ў сувязі з тым, што ў гэтым годзе прыём будзе 2 і 3 разы (увосень і зімою), значнае пагрозы пакуль што няма. Тут толькі трэба адначыць, што галоўны наплыў заяў мы маем зараз у індустрыяльныя ВНУ і тэхнікумы, — ёсьць пагроза недабору ў гуманітарныя.

5) **Харчаваньне студэнтаў.** Гэта пытаньне набывае сёлета асабліва важнае значэньне таму, што тая сетка сталовак, якая цяпер ёсьць, хоць-бы ў такіх цэнтрах, як Менск, Гомель і Віцебск ня можа здаволіць харчаваньнем студэнтаў. НКА паставіў перад СНК пытаньне аб тым, каб спажывецкая каапэрацыя ўзяла на сябе арганізацыю грамадзкага харчаваньня студэнтаў, СНК прапанаваў Белкаапсаюзу заняцца гэтаю справаю, але на вялікі жаль, наша каапэрацыя вельмі марудна варушыцца і ў нас няма ўпэўненасьці, што без патрэбнага націску на каапэрацыю, як з боку РСІ, гэтак і прафсаюзаў, гэтая справа сваячасова будзе наладжана.

Вось тыя асноўныя пытаньні, якія стаяць у гэтым годзе перад адпаведнымі савецкімі органамі і грамадзкімі арганізацыямі ў справе падрыхтоўкі кадраў і наогул падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Пасьля таго, як ужо быў закончаны гэты артыкул, паступілі весткі з некаторых акруг (Віцебск, Полацак, Магілеў) аб тым, што, ня гледзячы на дырэктывы ЦК КП(б)Б і настановы СНК, ні партыйныя, ні прафэсыянальныя арганізацыі, сур'ёзна справаю падрыхтоўкі да навучальнага году ня цікавяцца, ёю ня кіруюць. Становішча складаецца проста пагражаючым, асабліва з памяшканьнямі, харчаваньнем і нават камплектаваньнем, асабліва пэдагагічных навучальных устаноў. Слухачы з выпушчаных курсаў па падрыхтоўцы на разьмеркаваньням камісій, а пакі ў ВНУ і тэхнікумы не паступаюць згодроўваюцца рознымі арганізацыямі ў іншыя рэспублікі. Асабліва дрэнна справа з разьмеркаваньнем мабілізаваных ЦК КП(б)Б і ЦК КСМ 300 чал. партыйцаў і 1.000 чал. членаў КСМ.

Мы лічым што трэба зрабіць каранны пералом.

Трэба мабілізаваць увагу на гэта пытаньне ўсяе савецкае грамадзкасьці, высьвятляць яго ў друку, стаіць на абгаварэньне рабочых брыгад, на сходах, пад пырокі рабочы кантроль. Толькі такім чынам мы зможам справіцца з вялізарнейшаю задачаю культурнага ўздыму працоўных мас і падрыхтоўкі кадраў.

А. ПЛАТУН.

Увага гісторыі пралетарыяту Беларусі

У гісторыі клясавай барацьбы на Беларусі другой паловы XIX і XX стагодзьдзя пралетарыят адыгрываў вялізную гістарычную ролю. Ня гледзячы на гэта, нельга сказаць, каб у гістарычнай навуцы Беларусі на пралетарыят зварочалі тую ўвагу, якую ён дугоўвае. Зразумела, у агульных курсах па гісторыі Беларусі ёсьць асобныя ронкі прысьвечаныя гісторыі пралетарыяту. Мы маем у журналах асобныя боты, якія закранаюць той ці іншы гісторыі пралетарыяту Беларусі. Але ўсе гэтыя работы па гісторыі пралетарыяту Беларусі насілі і носяць зусім выпадковы характар і займаюць зусім нікчэмнае месца ў агульна-гістарычнай навуковай прадукцыі. Нельга ўзнаць такое зьявішча на гістарычным фронце Беларусі нармальным. Нельга не адзначыць і таго, што у Акадэміі Навук БССР да апошняга часу амаль не займаліся гісторыяй пралетарыяту Беларусі.

Пралетарыят Беларусі не карыстаецца ўзнаньнем з боку пэўных колаў люй. Мы не памыліся, калі скажам, што ў гэтых колах людзей пануючай ідэалёгіяй зьяўляецца ідэалёгія нацыянал-дэмакратызму. Нацыянал-дэмакратызм, як вядома, бачыць у Беларусі ласа-перасчэпленае сялянства плюс ласа-перасчэпленую інтэлігенцыю. Сялянская інтэлігенцыя, па іх думцы, зьяўляецца дэміургам гісторыі Беларусі XIX і XX стагодзьдзяў. З пункту гледжаньня нацыянал-дэмакрата ў Беларусі ня былі ні свайго капіталізму, ні буржуазіі, ні пралетарыяту. Адсюль жадзе ўзьнікае адмаўленьне роли пралетарыяту ў Беларусі ў рэвалюцыйным руху і росту царызму і капіталізму.

Ня трэба многа доказваць, што нацыянал- дэмакратычная гістарычная тэорыя аб ролі пралетарыяту Беларусі ня хільна прыводзіць да пэўных палітычных вынікаў. Адмаўляючы ролю пралетарыяту, няхільна прыходзіць да **адмаўленьня ролі камуністычнай партыі**—партыі пралетарыяту, да **адмаўленьня заканамернасьці** пралетарскага кіраўніцтва яго партыяй Беларусі.

З усяго вышэй сказанага абсалютна высьвятляецца тое **вялізарна-палітычнае значэньне,** якое мае зараз **работа над гісторыяй пралетарыяту Беларусі.** Трэба зьвярнуць многа ўвагі на работ

Калгасы абменьваюцца вопытам разьмеркаваньня ўраджаю

Калгас „Энгельс" зьвяртаецца да індывідуальнікаў:

—НАШ ПРЫБЫТАК У ДВА РАЗЫ ВЫШЭЙ ВАШАГА---

ШТО ДАЕ ПРОСТАЕ СКЛАДАНЬНЕ СРОДКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

„Пераважнасьці сацыялістычнай буйной гаспадаркі выкрыліся з нячуванай сілай, а гэта і ёсьць галоўнае".
(ЯКАЎЛЕЎ).

Мы, калгасьнікі калгасу імя Энгельса, Уваравіцкага раёну, Гомельскай акругі, на працягу 8 дзён шырока і горача абгаварвалі пытаньне разьмеркаваньня новага ўраджаю і вынікі калектыўнай працы першай бальшавіцкай сяўбы. Мы добра азнаёміліся з пастановамі ўраду калгасцэнтру СССР і БССР па пытаньні аб парадку разьмеркаваньня новага ўраджаю.

На сваім агульным сходзе ад 7-га жніўня мы канчаткова зацьвердзілі парадак разьмеркаваньня ўраджаю і пастанавілі паслаць рапарт газэце „Зьвязда".

Мы просім наш цэнтральны орган КП(б)Б надрукаваць наш рапарт з тым, каб усе калгасы нашай рэспублікі на старонках „Зьвязды" выказалі сваю думку аб парадку разьмеркаваньня ўраджаю і паказалі-б на дапушчаныя намі памылкі.

Калгас наш малады. Мы арганізаваліся толькі ў гэтым годзе, у пачатку вясны. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б мы ламаем усё старое, струхнелае, ламаем стары быт і будуем новае сацыялістычнае грамадзтва.

Наша сям'я--1278 душ...

Калгас наш яднае 256 гаспадарак (з іх 5 адзіночак), у тым ліку батрацкіх 11, бядняцкіх і серадняцкіх 165. З самага пачатку арганізацыі калгасу народ нас ніякіх хістаньняў ня было. Ні аднаго выхаду з нашага калгасу ня было.

Мы, усёй вёскай Радзеева, за выключэньнем аднэй гаспадаркі (Карпенка Сьцяпан), у ліку 210 гаспадарак арганізавалі калгас імя «Энгельса». У часе сяўбы да нас далучыліся яшчэ тры пробныя калектыўныя гаспадаркі: імя Карла Маркса, «Лапічы», «Кірэева Паляна» са складам 46 гаспадарак. Зараз наша сям'я складае 1.278 душ, з іх працаздольных — 710 чал., непрацаздольных — 568 чал. (дзяцей — 514 і старых—54). Калгас наш мае плошчу ў 3.700 гэкт., з якіх пад пасевамі — 1.405 гэкт. і пад папарам 355 гэкт.) сенажаці — 450 гэкт.

Па-бальшавіцку засеялі, па-бальшавіцку ўбралі

Плошчу пад яравыя засевы мы павялічылі на 350 гэкт., што складае 25 процантаў у параўнаньні з мінулым годам.

Веснавую сяўбу мы правялі па-бальшавіцку, перавыканаўшы плян на 5 проц. Мы ўжывалі агранамічныя мерапрыемствы (радковы засеў, гатункавае насеньне, штучнае ўгнаеньне, праручнаньне насеньня, засеў на цаліне). У выніку мы маем куды большы ўраджай у параўнаньні з мінулымі гадамі. У адзіночку, зразумела, мы ўсё гэта зрабіць бы не змаглі.

Валавы прыбытак нашай гаспадаркі ў гэтым годзе, як ніколі раней, высокі. Уборку азімых і яравых мы скончылі па-баявому і своячасова. Увесь час уборкі ўсе калгасьнікі (600 чал.) працавалі ўдарна. Цяпер мы прыступілі да абмалоту. І можам вызначыць наш валавы прыбытак ад большасьці культур.

Даход, паводле нашых разьлікаў, мы атрымаем наступны:

Аб гэткіх прыбытках раней і ня марылі

Наш прыбытак ад усіх галін гаспадаркі — 217.374 руб. У тым ліку, ад земляробства: 160.470 руб., ад гародніцтва—21.274 руб. і лугаводзтва —9.312 руб.

Мы яшчэ маем вялікі прыбытак ад рагатае малочнае жывёлы. Мы ўсё захады прымаем да таго, каб пашыраць малочную гаспадарку.

У гэтым годзе ад 700 галоў малочнай жывёлы мы атрымліваем 778.680 літраў малака. Малако мы здаем пралетарскім цэнтрам Гомелю і інш., за яго толькі мы маем 62.294 руб. прыбытку.

Паводле падліку спэцыялістых, у гэтым годзе мы **здаем столькі малака, колькі здавалі кулацкія гаспадаркі раёну.** Апроч гэтага, мы маем прыплод маладняка 648 штук, якія дадуць прыбытак у 6.480 рублёў. І так, толькі **ад аднае жывёлагадоўлі мы атрымліваем 68.774 рублёў.** Аб такім прыбытку мы раней і думаць не маглі.

У нас ёсьць дапаможныя дробныя прадпрыемствы, як кузьня, 6 ветракоў, майстэрня, у якой мы робім малатарні і інш. Усё гэта дасьць нам 9.036 руб. Мы зжалі 20 гэкт. жыта раскулачаных, што дало 2.508 рублёў.

Адсюль наша валавая прадукцыя ад усіх галін гаспадаркі складае суму ў 271.374 руб. (агулам). Гэта паводле самых мінімальных нашых падлікаў.

Калгасная арыфмэтыка

Для таго, каб правільна разьмеркаваць ураджай, мы перш за ўсё падлічылі нашу даходнасьць ад паляводзтва, агародніцтва і абагуленай малочнай жывёлы, што дало нам суму ў 209.716 рублёў.

З гэтае сумы мы вылічваем 5 проц. ў фонд, які падлягае разьмеркаваньню наміж членамі арцелі за абагуленую маемасьць.

Гэта складае суму ў 10.485 руб. 80 к. Абагуленая намі маемасьць каштуе 53.519 руб. Такім чынам, на кожны абагулены рубель прыпадае 19,76 кап.

Прыбытак, які застаўся пасьля гэтага (260.889 руб.), мы разьмеркавалі наступным чынам:

а) Насенны фонд з 20 проц. пашырэньнем плошчы складае 20.764 руб.;

б) страхавы фонд (насенны) 2.076 рублёў;

в) фуражны фонд—20.715 руб.;

г) сельгаспадатак — 2.000 руб.; страхоўка — 3.500 руб.; прыкрыцьцё доўгу і %% па ім—43.465 рублёў.

Усе выдаткі складаюць суму ў 92.520 руб. Такім чынам, умоўна, частцы прыбытак нашае гаспадаркі складае суму (260.889 р. мінус 92.520 р.) 168.369 рублёў. З гэтае сумы мы ўхвалілі зрабіць наступныя адлічэньні:

1) У непадзельны капітал мы адлічваем 10 проц. (16.837 руб. агулам);

2) культурна-бытавы фонд і дапамогу вучным калгасьнікам 2 проц. (3.367 руб.);

3) для прэміраваньня лепшых калгасьнікаў 2 проц. (3.367 руб.);

4) і, нарэшце, для забесьпячэньня і дапамогі непрацаздольным — 3 проц. (5.050 руб.).

Як мы забясьпечваем непрацаздольных

Усіх непрацаздольных мы падзяляем на тры катэгорыі.

а) Дзеці да 10 год атрымліваюць 36 рублёў у год; б) дзеці ад 10 да 14 год атрымліваюць 60 руб.; в) непрацаздольныя старыя, якім больш 60-ці год атрымліваюць 90 рублёў. Першыя дзьве катэгорыі, па нашай пастанове, атрымліваюць гэту дапамогу поўнасьцю пры той умове, калі іх бацькі працуюць у гаспадарцы ня менш 75 проц. усіх працоўных дзён у год. Тыя, што працуюць ад 25 проц. да 75 проц., атрымліваюць дапамогу на дзяцей у падавінным разьмеры; тым, хто працуе менш 25 проц. працоўных дзён дапамога зусім не даецца. Што датычыцца старых, дык усе яны (за малым выключэньнем) працуюць на тэй або іншай рабоце і атрымліваюць поўнасьцю вызначаную дапамогу з тым, аднак, каб не перавысіць сярэдняга заработку працоўнага.

Таную сыстэму дапамогі мы зрабілі для таго, каб паказаць усім тым, хто кепска працуе або зусім ня выходзіць на работу, што наш калгас не сабез. Мы гэтым даем стымул для ўзьняцьця прадукцыйнасьці і зацікаўленасьці ўсіх працаздольных да работы. І сапраўды, пасьля абмеркаваньня пытаньня і парадку разьмеркаваньня ўраджаю і прыбытку калгасу, прадукцыйнасьць працы ў нашым калгасе павялічылася як ніколі. Апошнія дні на работу выходзяць усе 100 проц. працаздольных, дзякуючы чаму замест нястачы рабочае сілы мы маем вялікі яе зьлішак.

Апрача таго, мы пастанавілі аддаць большую ўвагу разьвіцьцю нашае жывёлагадоўлі. Для гэтае мэты мы вызначаем фонд у 8.250 руб., якія павінны будуць пайсьці на паляпшэньне народы і ўзрост маладняка.

Мы лічым, што гэта сума для такога вялікага пагалоўя рагатае жывёлы — 816 галоў і 345 шт. маладняка — мізэрная, але трэба прыняць пад увагу тое, што з усіх крэдытаў, якія мы атрымліваем у гэтым годзе, каля 25.000 руб. пайшло на жывёлагадоўлю.

Па колькасьці і якасьці

Усю астатнюю суму (131.497 руб.) мы пастанавілі разьмеркаваць **па колькасьці і якасьці затрачанае працы кожным калгасьнікам.** Пры вызначэньні якасьці працы нам дапамагла 7-мі разрадная тарыфная сетка, якая ўведзена з 1-га сакавіка. Суадносіны паміж першым і сёмым разрадамі складаюць 1:3.

Усю працу ў арцелі праўленьне ўлічвае паводле спэцыяльных картак (у гадзінах і днёх) і кожны месяц заносіць у асабовы табель кожнага работніка паасобку. Калгасьнікі да 1-га жніўня адпрацавалі 46.266 чалавекадзён. Да канца гаспадарчага году, па нашым падліку, будзе патрачана 35.920 чалавека-дзён, а ўсяго за год 82.186 працоўных адзінак.

Такім чынам, на кожны чалавекадзень прыпадае 1 руб. 62 кап.

А калі ўлічыць нашы гароды, якія знаходзяцца ў індывідуальным карыстаньні і азімыя, дык наш працоўны дзень ацэньваецца больш 2-х рублёў. **Гэта сума для нас нябывалая.**

Чаму Андрушкевіч заробіў у тры разы больш чым Андрэенка

Што-ж атрымае кожны калгасьнік? Аб гэтым сьведчыць ніжэйпаданая табліца.

№№	Прозьвішчы калгасьнікаў	Едакоў	Працаздольных	Працад. адзінак да 1-VIII	Працад. адзінак да канца году	УСЯГО працоўных дзён	Сума прыбытку ў рублёх: За працу	За маемасьць	Дапамога непрацаздольным	РАЗАМ
1	Андрэенка Т. (бед.)	7	2	92	70	162	259	26	18	303
2	Андрушкевіч Я. »	9	3	308	231	539	860	—	—	860
3	Васілёнка Т. (сер.)	12	7	769	577	1336	2137	81	—	2218
4	Леташкоў Е. »	10	5	386	280	672	1075	120	—	1195
5	Музычанка Т. (м. с.)	6	2	392	294	685	1096	75	—	1171
6	Барабанаў Я.»	6	2	544	406	950	1520	36	—	1556

Цяпер кожны з нас можа вылічыць гадавы прыбытак, вынікі калектыўнае працы першага году. Гадавы прыбытак кожнага залежыць ад таго, колькі працоўных адзінак (і іх якасьць) затрачана кожнай гаспадаркай. Узяць хаця-б нашага калгасьніка т. Андрэенку Т. Ён **пры двух працаздольных прапрацаваў 92 дні, а ўсяго за год прапрацуе 162 дні. Вось чаму яго прыбытак (разам) складае 303 руб. На непрацаздольнага ён атрымлівае 18 руб. замест 36 руб. А вось Андрушкевіч, таксама бедняк, пры 3-х працаздольных, атрымаў амаль у 3 разы больш чым т. Андрэенка. Гэта таму, што больш і лепш працаваў.**

Добра працаваў і Барабанаў Я. Пры 2-х працаздольных ён атрымлівае 1.556 руб.

Паказаныя намі лічбы, паўтараем, самыя мінімальныя. Яны зьяўляюцца лепшым агітатарам за калектывізацыю.

Мы цяпер усім індывідуальнікам нашага раёну пакажам, што наш даход ў два разы большы іх даходу, што жыць у калгасе куды выгадней і лепш.

Лішкі збожжа--пралетарскай дзяржаве

Такі прыбытак дазваляе нам здаць пралетарскае дзяржаве вялікую колькасьць лішкаў розных прадуктаў. На сёняшнім сходзе мы пастанавілі здаць дзяржаве ня менш 820 цэнтнэраў яравых, што складае ¼ частку нашага валавога ўраджаю. Мы маем вялікі лішкі жыта — 700 цэнтнэраў, якое мы жалі капектыўна і склалі ў асобныя сьвірны па 4—6 гаспадароў разам.

Мы маем нябывалыя раней лішкі бульбы—10 тысяч цэнтнэраў, якую таксама здамо пралетарскай дзяржаве.

Пры падліку нашых лішкаў мы ўпэўніліся ў тым, што можа даць простае складаньне нашых сродкаў вытворчасьці.

Трохтыднёвы заработак --на індустрыялізацыю краіны

Клясавыя ворагі шалёна вялі агітацыю за зрыў уборкі, за зрыў калектывізацыі. Адкрыта і замаскавана праз сваіх «агітпропаў» кулакі і антыкалгасныя элемэнты прымалі ўсе захады да таго, каб разваліць наш калгас. Іх агітацыя вяла да таго, каб разьмеркаваньне ўраджаю і прыбытку калгасу рабіць толькі па дварох і едакох; яны прадракалі нам, што нас пасодзяць на паёк, што мы будзем галадаць...

Але мы добра зразумелі хітрыкі клясавага ворага. Мы добра ведаем, што ўся гэта агітацыя вяла і вядзе да падрыву нашага маладога, але ўжо моцнага калгасу. Мы ўсе захады прымаем да таго, каб наш калгас яшчэ больш абярнуўся ў **мяцутны гаспадарчы арганізм,** каб ён быў яшчэ лепшым агітатарам за палітыку камуністычнае партыі, за калектывізацыю.

Сваім разьмеркаваньнем ураджаю па колькасьці і якасьці працы мы сапраўды наносім зьнішчальны ўдар усім нашым ворагам.

Апроч таго, мы на гэтым-жа сходзе аднагалосна пастанавілі: у адказ на імкненьні клясавых ворагаў сарваць будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі, **усім датэрмінова падпісацца на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» ў разьмеры 3-х тыднёвага заработку кожнага нашага працаздольнага калгасьніка.**

Старшыня сходу Зыбляў Кастусь

Члены прэзыдыуму сходу Літашкоў Н., Банузаў

Сакратар Ляскоў.

Райаграном РКС Салаў'ёў

На сходзе прысутнічала 297 чал.

Калгас імя Энгельса,

Уваравіцкі раён, Гомельская акруга.

Барацьба за хлеб—барацьба за пяцігодку за чатыры гады

Хлебны паток— СУСТРЭЦЬ ПАТОКАМ ВАГОНАЎ

Дзедаўская арцель у барацьбе з ударнай брыгадай

Начальнік ст. Калінкавічы галасуе супроць ударнікаў

За апошні час уся наша грамадзкасьць сочыць за падрыхтоўкай транспарту да асеньніх перавозак. Грамадзкасьць мае права патрабаваць ад усіх транспартных арганізацый баявой падрыхтоўкі да правядзеньня такой важнай палітычнай кампаніі, як хлебаперавозкі.

На жаль, трэба адзначыць, што зараз транспарт яшчэ не падрыхтаваўся як трэба да асеньніх перавозак. Пяройдзем да фактаў.

На Жлобінскім раёне заходніх чыгунак, на ст. ст. Бярэзіна, Бабруйск, Магілеў, Рагачоў — у апошні час сыстэматычна прастойваюць грузыкі і вагоны, з прычыны познай падачы апошніх. Грузчыкі, замест таго, каб працаваць 8 гадзін у дзень фактычна працуюць толькі 5, а ў канцы дня адміністрацыя скарыстоўвае работу ліпэнцаў на неарганізаваныя звышнармовыя работы. Гэта адбіваецца на заработнай плаце грузчыкаў, падаражае кошт пагрузачна-выгрузачных работ і выклікае сыстэматычныя прастоі вагонаў з грузамі. Адміністрацыя на мясцох (начальнікі станцый) часта імкнецца замазаць сапраўднае станоВішча рэчаў, маса не мабілізуецца на ліквідацыю прарываў. Па сутнасьці-ж прастоі тлумачацца амаль выключна нядбайнай работай апарату чыгункі. На ст. Бярэзіна, напрыклад, увесь час працавалі 2 маньўравыя цягнікі. Раптам раён зьнімае адзін з іх без усялякага вучоту работы станцыі. У выніку пасьля гэтага павялічыліся прастоі вагонаў і грузаў. Толькі пад націскам грамадзкасьці праз месяц цягнік быў зьвернуты.

Ёсьць шмат выпадкаў, калі з прычыны нядбайнасьці чыгуначных брыгад вагоны падаюцца не да месца работы, што выклікае нерацыянальную трату часу на маньўры ручным спосабам; вельмі-ж часта рабочыя ня могуць выконваць гэту работу ручным спосабам і тады вагоны прастойваюць цэлыя суткі.

Працоўная дысцыпліна на станцыях — апошняя справа ў адміністрацыі. Начальнікі станцый Магілеў і Рагачоў ня маюць ніякага ўплыву на рабочых грузчыкаў. Пасылаюць на работы, разьмяркоўваць работы так званыя «старшыні». Гэта прыводзіць да таго, што пастаянныя рабочыя часта адмаўляюца ад работы. У выніку частыя прастоі вагонаў.

На некаторых станцыях (Магілеў, Бярэзіна, Рагачоў) да гэтага часу ёсьць так званая «кружка» — калі па 50-100 рабочых увесь свой заработак за месяц дзеляць пароўну паміж усімі. Такі мэтад разьмеркаваньня заработку не дае магчымасьці ўзьняць прадукцыйнасьці працы, бо кожны паасобку не стымулюецца. Супроць «кружкі» ёсьць і пастановы ЦК саюзу месграпс.

«Кружка» — гэта супроць сацыпаборніцтва, супроць ударніцтва. Там, дзе «кружка», там ня можа быць сацыпаборніцтва. «Кружка» стымулюе рватва, а не падняцьце прадукцыйнасьці працы.

Ні адміністрацыя, ні нізавыя прафарганізацыі не задумаліся над гэтым пытаньнем. Наадварот, начальнік станцыі Калінкавічы, наперакор жаданьню рабочых расьпусьціў ударныя брыгады і ўвёў «кружку». Калі-ж рабочыя на агульным сходзе супярэчылі, дык адзін з адміністратараў заявіў: «Калі вы ня будзеце разам працаваць на сваім жаданьні, дык мы адміністрацыйным парадкам аб'яднаем вашы брыгады».

Трэба зараз-жа мабілізаваць масу чыгуначнікаў на зьнішчэньне ўсіх непарадкаў, якія ёсьць на чыгунцы, бо інакш транспарт ня здолее выканаць тэй вялікай задачы, якая на яго ўскладзена партыяй і рабочай клясай.

Трэба з'арганізаваць масу грузчыкаў ва ўдарныя брыгады, на аснове добраахвотнага падбору з тым, каб ударніцтва ў нас было ня толькі на паперы, але і на справе. Рашуча трэба зьнішчыць «кружку».

Адміністрацыя павінна больш цікавіцца становішчам пагрузачна-выгрузачных работ, а не стаяць у баку.

Рабочая каапэрацыя павінна палепшыць справу забесьпячэньня рабочых грузчыкаў, арганізоўваючы ларкі ва ўсіх мясцох работ. Трэба рашуча зьнішчыць такія зьявішчы, якія маюць месца, напрыклад, на ст. Рагачоў, дзе з грузчыка за прадукты ў сталоўцы ЦРК бяруць столькі-ж, колькі і з пасажыра.

Трэба забясьпечыць грузчыкаў абуткам.

Усе гэтыя мерапрыемствы трэба ня найхутчэй правесьці ў жыцьцё пры няўхільнай увазе ўсёй рабочай грамадзкасьці да асеньніх перавозак.

Старшыня ЦП саюзу транспартнікаў КАСЬЦЕВІЧ.

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» здае хлеб

У барацьбе за кадры

Пакласьці канец „жангляваньню" лічбамі і пастановамі

Падрыхтоўка кадраў для кадраў зрываецца

Пытаньне падрыхтоўкі кадраў для кадраў зьяўляецца адным з вузкіх месц ва ўсёй праблеме падрыхтоўкі кадраў. Асабліва гэта ў БССР, якая знаходзіцца ў гэтых адносінах у выключна цяжкім становішчы, бо пашырэньне нашых навуковых кадраў з іншых саюзных рэспублік становіцца для БССР справай амаль немагчымай, і здаецца, зусім зразумела, што такое становішча павінна было мабілізаваць усе сілы і сродкі, каб узьняць гэту справу.

Між тым, тыя адносіны, якія ёсьць да гэтага пытаньня з боку некаторых устаноў, прымушаюць біць трывогу.

Зараз канчаецца навучальны год асьпірантуры. Вынікі гэтага году для Беларускай сельска - гаспадарчай акадэміі таворацъ аб агіднейшым прарыве на гэтым вучастку. Акадэмія мае 53 асьпіранты, 47 проц. усяго складу і зараз ня маюць праграм падрыхтоўкі. Якасны склад асьпірантаў у большасьці не адпавядае запатрабаваньням сучаснасьці. Такія дысцыпліны, як палітэканомія, дыялектычны матэрыялізм і іншыя—па віне дырэкцыі і асьпірацкага бюро (якія ня прымалі да гэтага мер) не прапрацаваны. За цэлы год пытаньні аб практычным ажыцьцяўленьні дырэктыў парторганаў (ліст пленуму ЦК УсеКП(б), пастанова бюро ЦК КП(б)Б па справе акадэміі, пастановы камісіі РК КП(б)Б па стварэньне акадэміі) ні дырэкцыя акадэміі, ні бюро парткалектыву ня ставілі. Калі і ставілі, дык у сувязі з якім-небудзь іншым пытаньнем і то далей пастановы справа не пайшла.

У навукова - дасьледчую работу ўцягнуты вельмі малы процант, астатнія ня маюць ніякага ўяўленьня як яе праводзіць (асабліва мэтадалёгію).

Няма кіраўніцтва асьпірантамі ні з боку навучальнай часткі, ні з боку кіраўнікоў катэдраў, ні сэкцый НП, ні Галоўнавукі. Саматужніцтва (як хто ўмее і можа), адсутнасьць патрэбнага марксыцкага базісу — вось характэрная рыса работы большасьці асьпірантаў. Між іншым, некаторым з іх увосень давядзецца весьці заняткі са студэнтамі па заданьнях катэдры.

Час пакласьці канец таму «жанглёрству» лічбамі і пастановамі, якое ёсьць у акадэміі па пытаньнях падрыхтоўкі кадраў для кадраў.

Трэба: 1) **Зараз-жа ўзяцца за выкананьне дырэктыў па гэтых пытаньнях, якія ёсьць у акадэміі;** 2) **сканцэнтраваць усю справу падрыхтоўкі асьпірантуры ў аднэй установе, забясьпечыўшы гэтым моцнае ідэалёгічнае і арганізацыйнае кіраўніцтва ёй;** 3) **Зараз-жа нападзіць кантроль і праверку работы з асьпірантамі. Праверыць вынікі работы асьпірантуры ня толькі акадэміі, але і іншых ВНУ;** 4) **Прыняць рашучыя крокі для нападжаньня работы да пачатку новага году, (бо покуль што, відаць, ніхто і ня рыхтуецца), дабіцца выкананьня ўстановамі дырэктыў, якія ёсьць па гэтым пытаньні.**

Няма праграмы, няма навучальных плянаў

На старонках «Зьвязды» шмат пісалася аб становішчы сельска - гаспадарчай акадэміі. За апартуністычную практыку было распушчана партбюро калектыву акадэміі. Абрана новае бюро. Але... члены бюро парткалектыву разьехаліся на вакацыі, а з імі разам і сакратар бюро парткалектыву.

Спытаецца, што зроблена па падрыхтоўцы да новага навучальнага году? Ніхто з працаўнікоў акадэміі нават не адважыўся-б адказаць на гэта запытаньне.

Мне давялося гэтымі днямі быць у акадэміі і гаварыць з некаторымі навуковымі працаўнікамі па пытаньні падрыхтоўкі да навучальнага году. Тав. Пальгуеў кажа: «Ні на адным факультэце няма навучальных праграм, няма навучальных плянаў на факультэце арганізацыі тэрыторыі і мэханізацыі. Дагэтуль ня складзены прыймовыя камісіі, па прыёме новых студэнтаў. Між тым, трэба ўжо даўно было зрабіць расклад заняткаў па факультэтах».

Што робіць партарганізацыя акадэміі, дзе налічваецца каля 400 чалавек? Што робіць дырэкцыя? Трэба адпаведным парторганам зьвярнуць увагу на становішча партарганізацыі сельска - гаспадарчай акадэміі, зараз-жа паслаць туды адпаведнага таварыша, які-б даў кірунак у рабоце.

Г. Н.

Зрываецца работа

Справа ідзе аб факультэце «арганізацыі тэрыторыі» (былы зямляўпарадкоўчы) Беларускай Сельска-гаспадарчай акадэміі.

Партыйна-грамадзкая думка Акадэміі пры абгаварэньні пытаньня аб структуры акадэміі на 1930-31 г., выходзячы з рэальнага запатрабаваньня вытворчасьці ў спэцыялістых, выказалася за астаўленьне факультэту «арганізацыі тэрыторыі» як самастойнага факультэту з 2-ма аддзяленьнямі—інжынэраў па арганізацыі тэрыторыі і тапографа-геадэзычнага, што і было з прадстаўленьнем падрабязнага навучальнага пляну і тлумачальнай запіскай прадстаўлена ў НКА і НКЗ.

Памянёнымі наркаматамі гэта пытаньне было вырашана станоўча для акадэміі, гэта значыць НКА зацьвердзіў вучэбны плян і штаты па факультэт з 2-ма аддзяленьнямі—арганізацыі тэрыторыі і топографа-геадэзычнага, а НКЗ на пасяджэньні калегіі таксама вынес пастанову за астаўленьне самастойнага факультэту, з хадайніцтвам аб гэтым перад СНК БССР.

Паводле-ж пастановы СНК БССР аб структуры акадэміі на 1930-31 г. ф-т «арганізацыі тэрыторыі» выпаў з гэтай структуры, як самастойны факультэт, і заменены аддзяленьнем арганізацыі тэрыторыі ў складзе ф-ту эканомікі, арганізацыі і плянаваньня буйной с. г.

Рашэньне наркаматаў было вынесена пасьля пастановы СНК, **якая і да гэтага часу не адменена.** Рашэньне наркаматаў—непасрэдных кіраўнікоў — таксама не адменена. **Дзякуючы гэтаму атрымалася падвойнае становішча,** якое перашкаджае праводзіць арганізацыйную работу ф-ту (укамплектаваньне навуковымі працаўнікамі, студэнтамі, складаньне праграм і інш.). Гэтае становішча цягнецца ўжо каля 3-месяцаў, а пачатак навучальнага году таксама ўжо блізка.

Ня кажучы аб тым, што ф-т «арганізацыі тэрыторыі» трэба заставіць у тэй структуры, як ён зацьверджаны памянёнымі наркаматамі, аб чым павінна быць узьнята хадайніцтва перад СНК, **зараз-жа трэба ўнесьці яснасьць у гэта пытаньне,** бо навучальны год не чакае, і бязьдзейнасьці НКА і НКЗ у гэтым пытаньні павінен быць палажан капец.

Б.

Хто пусьціць у ход новыя фабрыкі і заводы?

Бюракраты зрываюць падрыхтоўку прамысловых кадраў

ВСНГБ і Наркамасьветы--за пяцігодку, але супроць фабзавучаў

АПАРТУНІЗМ НАРАДЗІЎ НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦЬ

Ужо цяпер прадпрыемствы Беларусі адчуваюць недахват кваліфікаванай рабочай сілы. Апартуністычная недаацэнка пяцігодкі некаторымі гаспадарнікамі нарадзіла непаваротлівасьць у падрыхтоўцы рабочай сілы. Асноўная крыніца кваліфікаваных рабочых—фабзавуч—быў амаль зусім забыты. Досыць сказаць, што за першы год пяцігодкі школы ФЗУ падрыхтавалі... **280 чал.,** а на будаўніцтва ФЗУ ня было асыгнавана ні аднэй капейкі. Схамянуліся толькі ў разгары другога году пяцігодкі, калі патрэбнасьць у кваліфікаваных рабочых настойліва пастукалася ў габінэты гаспадарнікаў. Апрача невялікіх сум, прадугледжаных прамфінплянамі некаторых гаспадарчых органаў, было асыгнавана на будаўніцтва ФЗУ **750.000 руб.**

РЫХТУЙ УЛЕТКУ САНІ

Трэці год пяцігодкі павінен павялічыць колькасьць рабочых рэспубліканскай прамысловасьці **на 22.400 чал.** Паводле мінімальнай намёткі, школы ФЗУ павінны даць у канцы трэцяга году пяцігодкі 6.000 кваліфікаваных маладых рабочых, а васеньні і зімовы пабор 1930-31 году, паводле пляну, павінны даць у школы ФЗУ... 3.000 вучняў, але, калі ўлічыць розныя «аб'ектыўныя» ўмовы, якія ствараюцца «суб'ектыўнымі», правільней, бюракратычным падыходам да гэтай справы з боку розных асоб і арганізацый, то і гэта апошняя кантрольная лічба наўрад ці будзе выканана.

Хто-ж тармозіць падрыхтоўку кваліфікаванай рабочай сілы?

ФЗУ НЯ ВОЎК, У ЛЕС НЯ ЎЦЯЧЭ

Прэзыдыум ВСНГБ змагаецца з сваім сэктарам кадраў, стрымліваючы прытасьць апошняга ў справе забесьпячэньня асеньняга набору ў школы ФЗУ. Калі гэтымі днямі прэзыдыум ВСНГ разьбіў усё прамысловае будаўніцтва на некалькі катэгорый па ступэні тэрміновасьці, сэктар кадраў прапанаваў прыраўнаваць будаўніцтва ФЗУ да групы **ўдарнага** будаўніцтва. Але прэзыдыум ВСНГ з гэтым не згадзіўся. Тады сэктар кадраў прапанаваў прыраўнаваць будаўніцтва ФЗУ да **першачарговага** будаўніцтва, але і гэта прапанова не знайшла падтрыманьня. Такі-ж лёс напатакаў далейшыя прапановы сэктару кадраў аб аднясеньні будаўніцтва ФЗУ да другой, або трэцяй чаргі.

— Калі-ж будзем будаваць ФЗУ?

Нарашылі запісаць асобным пунктам, які нікога ні да чаго не абавязвае—«прапанаваць паскорыць» і г. д.

ЧАГО Ў НАС ТОЛЬКІ НЯМА...

Адсутнасьць памяшканьняў для ФЗУ і інтэрнатаў для вучняў стварае рэальную пагрозу зрыву раду фабзавучаў у Менску, Віцебску, Гомелі і Добрушы. Становішча ўскладняецца яшчэ тым, што ў гэтыя гарады прыедуць вучні з іншых гарадоў (Мазыр, Полацак, Бабруйск), дзе функцыянуюць падрыхтоўчыя курсы. (Усяго на падрыхтоўчых курсах займаюцца 1.200 падростка).

Гаспадарчыя органы праяўляюць сваю «зацікаўленасьць»—хто як можа. Згодна пастановы прэзыдыуму ВСНГ, памяшканьне заводу «Рухавік Рэвалюцыі», які ліквідуецца, ў сувязі з пускам Гомсельмашу, павінна быць адведзена для школы ФЗУ. Але Мэталлаб'яднаньне парашыла гэтае памяшканьне скарыстаць для рамонтных майстэрань. І ня гледзячы на некалькі загадаў ВСНГ, Мэталлаб'яднаньне ўпарта абараняе сваю пастанову.

У Менску будаўніцтва школы ФЗУ мэталістых **толькі пачынаецца.**

Нават тыя некалькі ФЗУ, якія ўжо існуюць, не карыстаюцца ўвагай гаспадарнікаў. Напрыклад, вучні ФЗУ швэйнікаў у Менску працуюць у вельмі кепскіх умовах.

НАРКАМАСЬВЕТЫ «ДАПАМАГАЕ»

Вузка ведамасьцьвеную пазыцыю ў адносінах да школ ФЗУ заняў Наркамасьветы. Калегія Наркамасьветы на сваім пасяджэньні ад 28-га чэрвеня г. г. (пратакол № 39), па пытаньні аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году, выносіць такую пастанову:

«§ 5. Дабіцца ад Наркампрацы: а) забароны камплектаваць курсы падрыхтоўкі ў ФЗУ і прыёму на вучэт біржы працы вучняў сямігодак і дзевяцігодак; б) выключэньня для навучальных устаноў БССР на менш 50 проц. слухачоў існуючых курсаў па падрыхтоўцы ў ФЗУ, якія займаюцца ў лік тысячы на сродкі Наркампрацы»

Гэта значыць: мала таго, што Наркамасьветы ставіць палкі ў колы камплектаваньня ФЗУ, ён яшчэ прабуе забраць для навучальных устаноў больш трэцяй часткі падлеткаў, якія рыхтуюцца ў ФЗУ.

ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ ЗАЙМАЮЦЦА САМАКРЫТЫКАЙ, АЛЕ... НІЧОГА НЯ РОБЯЦЬ

У гэтых спрэчках, ды і ва ўсёй гэтай рабоце прафарганізацыі **стаяць у баку.** На нарадзе пры сэктары кадраў ЦСПСБ, якая адбылася гэтымі днямі, работнік Белкамітэту саюзу мэталістых так проста і заявіў, што Белкамітэт у галіне камплектаваньня і падрыхтоўкі ФЗУ **нічога ня робіць.** Хоць такая шчырасьць—рэч вельмі добрая, але ці ня кажа гэта **аб адрыве Белкамітэту ад інтарэсаў мэталяпрацоўчай прамысловасьці,** якая перажывае вельмі востры недахват кваліфікаванай рабочай сілы?

Сакратар саюзу швэйнікаў замест адказу на сутнасьці, намаляваў цяжкае становішча менскага ФЗУ, што само на сабе сьведчыла аб «увазе» ЦП саюзу швэйнікаў да ФЗУ. Друкары паскаржаліся, што кадры ў іх рыхтуюцца самацёкам, бо прадпрыемствы паліграфпрамысловасьці ня маюць адзінага гаспадара.

А старшы інспэктар групы кадраў Наркампрацы заявіў, што калі асеньні набор у ФЗУ яшчэ ўдасца правесьці сяк-так, то веснавы набор пад пагрозай поўнага зрыву, бо ні гаспадарнікі, ні прафсыяналістыя не ўдзяляюць ФЗУ ніякай увагі.

У такіх умовах: **ігнараваньня гаспадарнікаў і Наркамасьветы і абыякавых** адносін прафэсыяналістых—праходзіць падрыхтоўка да заняткаў у ФЗУ, праходзіць падрыхтоўка новых кадраў для бурна ўзрастаючай прамысловасьці БССР.

ПРАЎДЗІН.

Слуцак не падрыхтаваны

„РАЙПАЛЯВОДСАЮЗХЛЕ БАЎСКАЯ" ЧЭХАРДА

Слуцак—жытніца Беларусі—зусім дрэнна падрыхтаваўся да хлебазагатовак. Праз склады Слуцку павінен прайсьці хлеб некалькіх раёнаў—Слуцкага і двух-трох сумежных з ім. Усяго—**1.500.000 пудоў.** Складаў-жа ёсьць толькі **на 200.000 пудоў.**

Асноўная база—элеватар не падрыхтаваны: няма пад'ездаў, не працуе пад'ёмная машына. Хто павінен клапаціцца аб ім—невядома: «Саюзхлеб» адсылае да Райпаляводсаюзу, а апошні да «Саюзхлебу».

Па ініцыятыве рабочых, вылучана брыгада па абсьледваньні падрыхтаванасьці ўстаноў да хлебазагатовак. Брыгада ўстанавіла, што ст. Слуцак зусім не падрыхтавана да прыёму збожжа, якое пачынае ўжо прыбываць з калгасаў Случчыны і Старобінскага раёну. На станцыі пры складах няма пакатаў, мосьцікаў і г. д.

Станцыя не забясьпечана асьвятленьнем. Рабочыя ўнесьлі прапанову даць на час хлебазагатовак сьвятло з гарадзкой электрастанцыі, хаця-б за кошт якога-небудзь кварталу гораду, але электрастанцыя не згаджаецца.

З прычыны галавацяпства лесбелаўскіх кіраўнікоў—на станцыі Слуцак шмат сустрэчных грузаў: са

Выканаем пяцігодку за чатыры гады

Калгасьнікі, пакажэце прыклад, будзьце пачынальнікамі падпіскі на вёсцы

МЕНШЧЫНА НЕ ДАДАЛА 410.000 РУБ.

Мала падпісацца на пазыку, трэба сваячасова яе сабраць

Кампанія па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі як па ўсёй Беларусі, так і па Менскай акрузе прайшла з вялікім уздымам. Так, Меншчына рэалізавала гэтае пазыкі на 4.928.300 руб., або выканала 158,9 проц. кантрольнае лічбы.

Але крэдытныя ўстановы, банкі, а таксама адміністрацыя прадпрыемстваў і ўстаноў, забыліся, што правядзенне падпіскі на пазыку, якой-бы пасьпяховай яна ні была, далёка не вырашае яшчэ справы. Застаецца яшчэ адна, ня менш адказная задача—апраўдаць сваячасова грашовымі ўзносамі праведзеную рэалізацыю.

Даўным-даўно скончыўся тэрмін выплаты грошай па падпісцы на 3-ю пазыку. А між тым, на сёнешні дзень гэтыя ўзносы яшчэ паступаюць. З прычыны нядбайных адносін да гэтае справы шмат якіх контр-агентаў і адміністратаў на сёнешні дзень мы маем па Менскай акрузе вялікую запазычанасьць.

Па адным Менску на 27 чэрвеня запазычанасьць па 3-й пазыцы складала 136.652 руб., а па раёнах акругі на 1 ліпеня—271.652 руб.

Гэта буйная запазычанасьць здарылася з прычыны маханічнага неплацяжу грошай падпісчыкамі, плыўкасьці штатаў апарату і памяншэньня падпісі. Некаторыя работнікі не вялі сыстэматычнага нагляду за ходам разліку па падпісцы і сваячасова не сыгналізавалі аб ненармальнасьцях, якія здарыліся да моманту канчатковага разрахунку.

Вось буйнейшыя крэдыторы па гор. Менску: **Белдзяржбуд—10.000 руб.** (ён нават ня ведае за кім лічыцца запазычанасьць), **1-я друкарня—9.703 р. 86 к., фабрыка «Адраджэньне»—3349 р. 78 кап.**

Значная частка запазычанасьці па акрузе падае на сялянскую падпіску (108,247 р. 64 к.). Яна ўтварылася дзякуючы «стараннай» рабоце РВК.

27 ліпеня адбылося пасяджэньне Менскай акруговай камісіі садзейнасьці дзяржкредыту. На ім былі заслуханы даклады контр-агентаў аб канчатковых выніках рэалізацыі 3-й пазыкі і ліквідацыі запазычанасьці. На пасяджэньні прыняты рад практычных мерапрыемстваў у гэтай галіне.

Крэдытныя ўстановы з дапамогаю рабочых брыгад і камісій садзейнасьці павінны зараз-жа ўзмацніць работу па ліквідацыі запазычанасьці. Трэба высьветліць прычыны гэтай запазычанасьці. Мабілізаваць адпаведным чынам грамадзкую думку.

Усю работу па ліквідацыі запазычанасьці па 3-й пазыцы трэба праводзіць пад знакам найхутчэйшага атрыманьня ўзносаў і дружнае падпіскі на пазыку «пяцігодка—за чатыры гады».

Гірштэйн.

„Нам яшчэ РВК ня прыслаў цыркуляраў"

Вось адказ старшыні Дукорскага сельсавету

На фабрыках і заводах Беларусі шырока разгарнулася падпіска на пазыку «пяцігодка—за чатыры гады». Рабочыя аднадушна прыходзяць на дапамогу дзяржаве. Не адстаюць і многія калгасы.

Але ў радзе месц вясковыя раённыя арганізацыі амаль нічога ня робяць для папулярызацыі пазыкі сярод асноўных мас сялянства. Так, у Сьмілавіцкім раёне (Меншчына) піша т. **Лявіцкі** насельніцтва нічога ня ведае пра новую пазыку. Ніякай растлумачальнай работы РВК не праводзіць, **камісія садзейнасьці фактычна абярнулася ў камісію бязьдзейнасьці.**

На запытаньне чаму ў Дукорскім сельсавеце нічога ня робіцца для распаўсюджваньня пазыкі, старшыня адказаў: **«Нам яшчэ РВК ня прыслаў цыркуляраў як праводзіць пазыку».** Трэба адзначыць, што ў сельсавеце яшчэ дагэтуль ня выплачана цалкам запазычанасьць па другой і трэцяй пазыках. Сельсавет да гэтай справы адněсься вельмі нядбайна.

Ня лепш абстаіць справа і ў Пухавіцкім раёне. Як паведамляе селькор Басько, сярод насельніцтва ніякай растлумачальнай работы не праводзіцца. Мясцовыя раёныя арганізацыі, як відаць, лічаць, што гэта не ўваходзіць у іх абавязкі. Зразумела, пры такой растлумачальнай рабоце далёка не паедзеш.

Дырэктывы ячэйкам у кішэні т. Сосінава

Калгасы Рэчыцкага раёну імя 10-годзьдзя БССР і імя Калініна з посьпехам правялі падпіску на пазыку «пяцігодка—за чатыры гады». У калгасе імя 10-годзьдзя БССР калгасьнікі падпісаліся на 1665 руб., замест вызначаных паводле пляну 1.500 руб. У калгасе імя Калініна калгасьнікі падпісаліся на 1057 р., замест вызначаных 1020 руб.

Рэшта калгасаў Рэчыцкага раёну ня выканалі падпіскі нават і на 20 проц. Партыйныя арганізацыі зваракаюць мала ўвагі на распаўсюджваньне пазыкі. Па Рэчыцы падпіска ідзе таксама нездавальняюча. Арыентыровачнае заданьне ў 234.000 руб. выканана толькі на палову.

У райкоме КП(б)Б два тыдні таму назад адбылося пасяджэньне, на якім былі выпрацаваны дырэктывы ўсім ячэйкам аб растлумачальнай рабоце, у зьвязку з пазыкай. Але гэтыя дырэктывы яшчэ і цяпер ляжаць у кішэні тав. Сосінава, які паехаў у дом адпачынку. Раніком не патурбаваўся у свой час разаслаць іх ячэйкам.

Брыгадзір «Зьвязды» ГІТУС.

Віцебскія прадпрыемствы адстаюць

Брыгада газэты «Віцебскі Пралетары» гэтымі днямі зрабіла праверку ходу падпіскі на пазыку «пяцігодка—за чатыры гады» па Віцебску. Праверка паказала, што падпіска праводзіцца ў большасьці прадпрыемстваў і ўстаноў далёка нездавальняюча. Слабасьць работы па падпісцы тлумачыцца тым, што арганізацыі ня сур'язна і несваячасова прыступілі да яе. Фабрычна-заводзкія арганізацыі не мабілізавалі актыву. Невыстарчальна праведзена растлумачальная работа сярод рабочых і служачых.

На панчошнай фабрыцы імя 1-га мая з 462-х рабочых і служачых з месячным заработкам у 18.500 руб., падпісалася на пазыку 251 чалав. на 4.785 руб. На акулярнай фабрыцы з 725 рабочых і служачых (месячны заработак 48.000 р.) падпісалася на пазыку 440 чал. (на 19.095 руб.).

Вучпрафсоская каса МББ чыгункі з 1.200 чалав. (месячны заработак 22.000 руб.) падпісалася на 1.220 руб.

У заразнай больніцы, напрыклад, дагэтуль яшчэ ня ставілася на агульным сходзе пытаньне аб пазыцы «пяцігодка—за чатыры гады». Даклад зрываўся два разы па віне **старшыні ЦП саюзу мэдсанпрацы,** які чамусьці лічыў немэтазгодным зьвязваць пытаньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі з пазыкай.

Лепш за ўсё ідзе справа ў гарадзкім тэатры, дзе ахоплена 100 проц. служачых на 75 проц. месячнага заработку. У аддзяленьні Белдзяржгандлю ўсе рабочыя і служачыя ахоплены падпіскай на пазыку на 62 проц. месячнага заработку.

Шафро.

Камісіі... бязьдзейнасьці

МАЗЫР (наш кар.). Падпіска на пазыку «пяцігодка—за чатыры гады» па гор. Мазыры разгортваецца вельмі марудна. Камісіі садзейнасьці на прадпрыемствах, таксама як і фабкомы, амаль нічога ня робяць для папулярэньня пазыкі. Некаторыя камісіі садзейнасьці самі падрываюць работу. Так, у акрземаддзеле, калі адзін з супрацоўнікаў зьявярнуўся да члена камісіі з запытаньнем чаму яму не дазволілі прадаць аблігацый для лячэньня хворае маткі, атрымаў адказ: «Вашай матцы даўно трэба памерці».

Гарадзкая камісія садзейнасьці зусім ня кіруе нізавымі камісіямі на прадпрыемствах. За ўвесь час ня было праведзена ні аднэй нарады. Былі выпадкі, калі падпіска зрывалася з-за недахвату бляткаў. Саюз будаўнікоў нічога ня робіць для папулярэньня пазыкі сярод сэзоньнікаў.

На фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» падпіску на пазыку пачалі толькі 25 ліпеня. На заводзе «Пралетары» 75 проц. рабочых нядаўна прышлі з вёскі, некаторыя з іх вядуць яўна контрэвалюцыйную агітацыю супроць падпіскі. Партыйная ячэйка і фабком плятуцца у хвасьце адсталай часткі рабочых і не вядуць ніякай растлумачальнай работы.

ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ Ў ПАРАДКУ САЦСПАБОРНІЦТВА

Завод імя Карла Маркса ў Ленінградзе атрымаў сьцяг за лепшае правядзеньне падпіскі па Ленінграду.

Бярэце прыклад з калгасу „Новае Жыцьцё"

КАЛГАС «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», САМАХВАЛАВІЦКАГА РАЁНУ, ПАДПІСАЎСЯ НА ПАЗЫКУ «ПЯЦІГОДКА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» НА 1200 РУБ., ЗАРПЛАТА-Ж КАЛГАСЬНІКАЎ СКЛАДАЕ 910 РУБ.

КАЛГАС ВЫКЛІКАЎ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА СУСЕДНІЯ КАЛГАСЫ.

В. ЯКІМОВІЧ.

Арганізавалі вучобу актыву

У Гомелі арганізаваны курсы па перападрыхтоўцы нізавога партактыву. Курсы былі ўкамплектаваны нізавымі партыйнымі работнікамі ў большасьці сакратарамі парткалектываў і цэхячэек.

За 3 скліканьні курсы маюць прапусьціць 80 слухачоў. Кожнае скліканьне працягваецца тры тыдні. Курсы сябе поўнасьцю апраўдалі. Асноўныя пытаньні ленінізму, пастановы XVI зьезду УсеКП(б) распрацаваны і ўсвоены курсантамі досыць добра. Дрэнна толькі тое, што пытаньне аб перабудове партработы было прапушчана, не распрацавана. Між тым, як гэта пытаньне мае ў сучасны момант актуальнейшае значэньне.

ЗЭЛЬМАНАЎ.

На дапамогу мастацкім гурткам

БЮРАКРАТЫ АД КУЛЬТРАБОТЫ

Па Беларусі разгортваецца зараз агляд клюбных гурткоў самадзейнасьці, які закліканы ўзьняць усю рабочую грамадзкасьць на дапамогу самадзейнаму мастацтву. Для нас не зьяўляецца сакрэтам тое, што самадзейнае мастацтва цяпер знаходзіцца яшчэ на становішчы «бяспрытульнага». Паспрабуем падмацаваць гэты факт матар'ялямі з месц.

У ваколіцы Гомеля—Беліцы ёсьць «маленькая» фабрыка «Вэзувій». На ёй працуе звыш 2.000 пралетараў. На мастацкую работу на гэтым прадпрыемстве адпускаецца ўсяго 25 руб... А між тым, у клюбе «Вэзувія» ёсьць і маюць усе пэрспэктывы на далейшае разьвіцьцё жывая газэта, піянэрская газэта, яўрэйскі драмгурток і музычны. Усе гэтыя гурткі зарэкамандавалі сябе сапраўднымі барацьбітамі мастацкага слова—за прамфінплян, за палітычнае выхаваньне рабочых і г. д. А ў каштарысе — «ракавая» лічба: **25 руб. ...**

Абслужыць мастацкую работу на такія грошы цяжка, фабком-жа і ведаць ня хоча аб прыбяўцы, калі яна не зацьверджана каштарысам.

Нельга лічыць правцтвам тое, калі культработнік дамагаецца сродкаў на мінімальнае афармленьне пастановак, на прыбяўку, пры гэтым вельмі нязначную, для запрашэньня добрага кіраўніка гуртка і г. д. Між тым, мясцовыя прафработнікі вызначаюць зараз каштарыс, які не адрозьніваецца ад каштарысу трох год незад. Гэта ў той час, калі, ў зьвязку з пераходам на бесьперапынку, стаяць ужо другія задачы. Прыбавілася зьменнае абслугоўваньне рабочых.

Такая кансэрватыўнасьць выклікае нэрвовасьць у рабоце культработнікаў, а іншы раз і арыў самае работы.

ГОРА-КІРАЎНІЦТВА

На гэтай фабрыцы была атрымана рэзалюцыя культнарады АПБ па перабудове культмасавай работы прафсаюзаў. У рэзалюцыі адзін пункт—прапаноўваў распусьціць культсэктары на фабрыках, дзе ёсьць клюбы, што зьяўляецца грубым скажэньнем рэзалюцыі ўсесаюзнае клюбнае нарады.

Фабком «Вэзувія» так і зрабіў... На адным з сваіх пасяджэньняў, абгаварыўшы рэзалюцыю, ён вызваліў ад работы загадчыка культсэктару, які арганізаваў вакол сябе моцны культактыў, пры якім работа па культабслугоўваньні цэхаў ішла поўным ходам. Як толькі такое рашэньне зьдзейснілася, работа пачала развальвацца.

Горш за ўсё тое, што ўсе большменш складаныя пытаньні мясцовыя культработнікі едуць разьвязваць у ЦП саюзаў, баючыся выраніць іх на месцы. Гэта адбірае ад работы на прадпрыемстве на некалькі дзён кваліфікаваныя культурныя сілы. А робіцца гэта таму, што мясцовыя прафарганізацыі не набылі адпаведнага аўтарытэту, не заўсёды спраўляюцца са сваімі задачамі. Асабліва гэта адчуваецца цяпер, у нэрыяд ліквідацыі округ.

Агляд-спаборніцтва мастацкіх гурткоў у сучасных умовах зьяўляецца, такім чынам, зусім сваячасовым і патрэбным.

Ул-аў.

Ідзе агляд гурткоў самадзейнасьці

У сучасны момант пачынае разгортвацца практычная работа па агляду клюбных гурткоў самадзейнасьці пры нашых клюбах.

Гэтымі днямі зьявярнуўся з спэцыяльнага вандраваньня па Беларусі прадстаўнік УсеЦСПС т. Уладзімераў. У гутарцы з нашым супрацоўнікам ён паведаміў, што зараз арганізаваны ўжо акруговыя штабы кіраўніцтва аглядам гурткоў самадзейнасьці ў Гомелі і Магілеве.

Пазаўчора-ж у культсэктары ЦСПСВ адбылося першае арганізацыйнае пасяджэньне цэнтральнага штабу кіраўніцтва аглядам.

На гэтым пасяджэньні вызначана апэрацыйная група пры штабе, у ліку 5 асоб. Групе даручана ў трохдзённы тэрмін распрацаваць канкрэтны плян работы і даць яго на разгляд штабу.

Цэнтральны штаб утварыў таксама кансультацыйнае бюро, якое мае абкансультацыйнае бюро, якое мае абслугоўваць па ўсіх пытаньнях агляду клюбны актыў, кіраўнікоў гурткоў і культбрыгады.

Юр.

Да ведама падпісчыкаў.

З ўчарайшым № газэты „Зьвязда" ўсім падпісчыкам разасланы дармовы дадатак—газ. «ПРАФРУХ» № 22.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ, 11 жніўня

— **Фрунз. РК КП(б)Б.** А 7 г. веч. у памяш. Мен. АК МОПР'у (Савецкая, 87) адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Фрунз. РК МОПР'у. Яўка членаў прэзыдыуму абавязкова. Запрош. актыў.

— **Сад Асьветы.** Кіно—«Галубы экспрэс». Пач. роўна а 10 г. веч. У выпадку дрэннага надвор'я кіно пераносіцца ў Дом. Білеты ў касе саду.

ЗАЎТРА, 12 жніўня.

— **Дом Асьветы.** А 7 г. веч. адбудзецца агульны сход камсамольскай ячэйкі. Прысутнасьць усіх камсамольцаў абавязкова без спазьненьня.

— **Клюб СГС.** А 8 г. веч. у памяш. клюбу саўгандальслужачых адбудзецца агульнаарганізацыйны сход харавога гуртка клюбу. Просьба да ўсіх, якія запісаліся ў гурток, зьявіцца к вызначанаму часу. Таксама прымаецца запіс у гурток штодзенна з 6-8 гадз. веч. у канц. клюбу.

— **БДУ.** А 19 гадз. у канц. факультэту наргасу (прыродазнаўч. корпус) адбудзецца сход навуковых працаўнікоў факультэту і ўноў запрошаных выкладчыкаў на работу ў факультэт па пытаньні аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году.

— **Дом Асьветы.** 17 жніўня а 4 гадзіны ў клюбе працасьветы адбудзецца агульна-гарадзкая нарада сакратароў ячэек «П. Н.», ліквідатараў няпісьменнасьці і малапісьменнасьці і арганізатараў-мэтадыстых. Яўка абавязкова.

— **БДУ.** Вайсковы табінэт БДУ адкрыты штодня з 9 да 15 гадз. за выключэньнем выхадных дзён: 5, 10, 15 і г. д.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара **А. МІТЛІН.**

«У дапамогу фабрычна-заводзкай газэце»—брашура выданьня БДВ, 8 жніўня разаслана «Кніга-поштай» пры Цэнтральнай Кнігарні БДВ усім васковым РК (КП(б)Б па 6—7 экз., гарадзкім РК КП(б)Б па 40 экз. Брашура павінна быць скарыстана, як дапаможнік для фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт і ячэек КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б.

«Кніга-поштай» пры Цэнтральнай Кнігарні БДВ.

12 жніўня, а 7 гадз. веч. у памяшканьні заўкому заводу „КАМУНАР" (Вакольная, рог Вясёлай вул.) адбудзецца

чарговае пасяджэньне Менскай гарадзкой камісіі садзейнічаньня Дзяржкрэдыту і Ашчадсправе

Парадак дня:

1. Інфармацыя камісіі садзейн. Мендзяржбуду і 1-й друкарні аб канчатковых выніках па ліквідацыі запазычанасьці па 3-й паз. індустр. і ходу падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».
2. Інфармацыя камісій садзейн. цацачнай фабрыкі «Возрождение», шчотачнай фабрыкі і працкалектываў в яровачнікаў і войлачнікаў аб ходзе падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» і праведзенай працы па ажыцьцяўленьні грамадзкага кантролю над продажам і закладам аблігацый.
3. Разгляд заяў.

Выкліканыя камісіі павінны мець пры сабе дакладныя весткі па інфармацыях.

Усім грамадзянам, якія падалі заявы на продаж і заклад аблігацый абавязкова зьявіцца ў вызначаны час.—Запрашаюцца на пасяджэньне рабочыя заводу **«Камукар».**

МЕНГАРКАМСОД.

ЦП саюзу саўгандальслужачых на 13 жніўня г.г. склікае

пашыраную нараду прафпрацаўнікоў

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Аб ліквідацыі округ і ўдзеле прафсаюзаў (дакл. урал. камісіі і адм.-сав.сэктару).
2. Вынікі перавыбарчай кампаніі МК і чарговыя задачы прафработы (даклады Гомельскага, Віцебск. і Мазырскага акрпраўленьняў і арг.-інструкт. сэктару ЦП).
3. Аб ходзе і ўдзеле ва ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі (даклады Бабруйскага і Магілеўскага АПС, Барысаўскага райадз., Заслаўскага РГК і гандлёва-каап. сэктару ЦП).

На нараду павінны зьявіцца ўсе старшыні АПС саюзу СГС (або іх намесьнікі), па адным старшыні РГК з кожнай акругі і ўсе старшыні РГК Менскае акругі, а таксама ўсе старшыні НК і ГК саюзу СГС г. Менску.

Нарада адкрываецца 13 жніўня а 11 гадз. раніцы ў памяшканьні клюбу саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай).

ЦЫРК Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА.

У панядзелак, 11 жніўня адбудзецца

СПАРТЫЎНАЕ ЗРЭЛІШЧА

ў 3-х вялікіх аддзяленьнях

пры ўдзеле **ПОЎНАГА АНСАМБЛЮ ТРУПЫ.**

Рад атракцыёнаў. Конкурс наезьнікаў.

Пачатак а 8 г. 30 м.)—(КАСА адкрыта з 11 да 2 і з 5 да 10 г. 30 м.

Рабоч. каса—з 12 да 2 і з 4 да 6 г. веч. Адказны кіраўнік СТРАШЭВІЧ.

Кіно-тэатр **„КУЛЬТУРА"**

3 панядзелка, 11 жніўня

Гістарычны мастацкі фільм паводле аповесьці **Лермантава**

КАЎКАСКІ НЯВОЛЬНІК

кіно-паэма ў 6 частках. Сцэнары—**П. Шчэгалёва,** Рэжысэр—**А. Іваноўскі,** Аператар—**Н. Аптэкман,** Мастак—**М. Левін.**

У галоўн. ролях: Галіна Краўчанка, Тамарын, Худалеяў, Падвальны, Хапэрман.

Пачатак роўна а 7 г. Каса—ад 5 гадз.

УВАГА: пры калектыўным паведваньні кіно «Культура»—

скідка на ўсе білеты **25 проц.**

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

з панядзелка, 11 жніўня

ВЫКЛЮЧНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ПАВОДЛЕ РАМАНУ С. ФЛОБЭРА

САЛАМБА

Гістарычная драма ў 7 частках

Рэжысэр П'ЕР МАРОДЭН

У галоўн. ролях:

Жана дэ-Бальзак, Ролла Норман, Віктар Віна, Рафаэль Левін, Анры Бадэн.

Штодзенна 3 сэансы.

Пачатак 1-га—а 7 г., 2-га—8 г. 30 м., 3-га—10. Каса—ад 5 г.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва

Да ведама экскурсантаў і ўсіх наведвальнікаў 1-ай Усебеларускай Выстаўкі

СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

НА ЎСЮ ЛІТАРАТУРУ, ЯКАЯ ПРАДАЕЦЦА НА ТЭРЫТОРЫІ ВЫСТАЎКІ

даецца скідка 25 проц.

Панядзелак 11, Аўторак 12, Серада 13, Чацьвер 14 і Пятніца 15 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

„РАЗЛОМ" В. Лаўрэнаў. п'еса ў 4-х дзеях

Пастаноўка С. Рэзэнава. Мастак Ю. Гольц

Музыка Л. Полавінкіна. Дырыжэр І. Гіттарц.

Памрэж. С. Калашнікаў)—(Пачатак а 8 з пал. г.

Білеты прод. у касе тэатру, у роб. касе і на выстаўцы.

Белдзяржкіно сумесна з Аршанскім акрвыканкомам

ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО

САВЕТАМ ЖУРЫ па разглядзе праектаў кіно і тэатру — у г. ВОРШЫ —

прысуджаны наступныя прэміі:

1-АЯ ПРЭМІЯ пад дэвізам «Лацінскае ЭС»—аўтары: арх. Воінаў, Крылоў, Валодзька і Гіляраў (Менск).

2-Я ПРЭМІЯ пад дэвізам «Праца» — арх. Ведзянін (Вятка).

3-ЯЯ ПРЭМІЯ пад дэвізам «Ворша»—праф. Падбярэскі («Детское село»).

4-АЯ ПРЭМІЯ пад дэвізам «Чырвоны квадрат» (наклеены) аўтары: Гіляраў, Валодзька, Крылоў і Воінаў (Менск) пры ўдз. Р. Намет.

5-Я ПРЭМІЯ паддэвізам «Пяцігодка»—аўтар арх. Лангбард (Ленінград).

РЭКАМЭНДАВАНЫ ДА НАБЫЦЬЦЯ:

1-АЯ РЭКАМЭНДАЦЫЯ—праект пад дэвізам «А» (друкаванае)—Растоў.

2-АЯ РЭКАМЭНДАЦЫЯ—праект пад дэвізам «Сатурн»—Кутаіс.

БЕЛДЗЯРЖКІНО АРШАНСКІ АКРВЫКАНКОМ.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакумэнты

лічыць несапраўднымі:

Асабов. пасьведч. Падмаркава В. С., выд. Мен. шк. вучн. МББ чыг. 1714

Чл. біл. саюзу СГС № 13775, пашп. № 8656, выд. Магіл. міліцыяй на імя Васкрэсенскага С. І. 1715-1716

Асабов. пасьведч. і пасьведч. на правядз. работ, выд. выканад. бюро Белдзартрансу на імя Міронава К. С. 1717

Чл. біл. саюзу гарбароў Каган Х. М. 1718

Бірж. карт. Пацкевіч Е. Ф., выд. Мен. бірж. працы 1719

Чл. біл. саюзу працасьветы, асабов. пасьведч., выд. Койдан. 7-годкай школы імя Качко А. 1720-1721

Парт. біл. № 0811455 Закс Я. А., выд. Полацк. АК КП(б)Б 1722

Пашп. Кравеца Б. В., выд. Мен. міліцыяй 1723

Пашп. Кравец П.—М. Ф., выд. Мен. міліцыяй 1724

Мэтр. вып. Красьніцкага А. А., выд. Мен. ЗАГС'ам 1725

Вайск. кн. Стрыго І. Т., выд. Мен. ваенкаматам 1726

Лек. кн. Максіменко М. М., выд. Мен. страхкасай 1727

Чл. біл. саюзу СГС Жураўлева Ф. Ф. 1728

Вайск. кн., выд. Мен. ваенкаматам, чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6/3354 Вяржбіцкага У. І. 1729-1730

Асабов. пасьведч. Сафарэвіча А., выд. Белкалгасцэнтрам 1731

Вуч.-конск. карт. Давідовіча З. І., выд. Астр.-Гарадз. РВК 1732

Чл. біл. «саюзу будаўнікоў Мароза А. Х. 1733

Мэтр. вып. Гурыновіча М. А. выд. Мен. ЗАГС'ам 1734

Каап. кн. Залуцкага П. Ф., выд. Мен. прыг. спаж. т-вам «Земляроб» 1735

Пасьведч. Шпакоўскай М. Ю., выд. Мен. міліцыяй 1736

Паявая кн. Камінскага М. І., выд. ТПО МББ чыг. 1737

Дапрыз. кн. Маль С. А., выд. Мен. ваенкаматам 1738

Пасьведч. № 93, выд. практ.-пасад. 7-годкай пры БПТ, мэтр. вып., выд. Мен. ЗАГС'ам на імя Фрыда І. Б. 1739-1740

Пасьведч. аб скончэньні БДУ Шубнай Л. А. 1741

Пасьведч. аб скончэньні Пухавіцкага 7-годкі Лінькіка В. З. 1742

Асабов. пасьведч. № 690 Яворскага І. А., выд. АДПУ 1743

Вайск. пасьведч. № 5 стр. п., канц. карт. № 286, выд. [illegible] 2 Бел. дэп. на імя Ахрамовіча І. Л. 1744-1745

Мэтр. вып. № 30, выд. Перас.-Залесск. ЗАГС'ам, пасьведч. аб скончэньні Лягонск. 7-годкі Лапотка П. А. 1746-1747

Вайск. біл. Таболіча Р. А., выд. Смалявіцк. РВК 1748

Дзведка аб працы Апенка Е. Г., выд. адз. грамадзк. работ Менкамгасу 1749

Чл. біл. саюзу чыгуначн. Антаненка А. М 1750

КІНО **СПАРТАК.** 3 панядзелка, 11 жніўня

Выдатны фільм **ДЗІНА-ДЗАДЗУ**

драма ў 7 част.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ:

6 г., 7 г. 30 м., 9 г. 15 м., 11 г.

КАСА—ад 5 гадз.

Прыём заяў і іспыты ў Беларускую Дзяржаўную Акадэмію Сельскай Гаспадаркі

ПРАЦЯГНУТЫ ДА 25 ЖНІЎНЯ

Усе асобы, якія падалі заявы на факультэты акадэміі і падлягаюць, згодна існуючага палажэньня, іспытам, павінны да паказанага часу прыбыць у акадэмію.

Дырэктар Акадэміі Пінчук.

ЗГУБЛЕНА

круглая ПЯЧАТКА с.—г арцелі «Іскра Сацыялізму», ф. Стралкі, Рагачоўскага раёну, Бабруйскай акругі.

Лічыць несапраўднай. Знайшоўшага просьба зьвярнуць па адрасе: ст. Менск-тав., клюб «Ільліча», старшыні калгасу «Іскра Сацыялізму» т. Кажыніну.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

3 панядзелка, 11 жніўня

НОВАЯ ВЯСЁЛАЯ КАМЭДЫЯ

ВЫТВОРЧАСЬЦІ САВКІ О

22 НЯШЧАСЬЦІ

Рэжысэры: С. Барцэняў і С. Герасімаў. У галоўн. ролях: С. МАГАРЫЛ, Я. ЖЭЛТОЎ, Е. КУЗЬМІНА, А. КАСТРЫЧКІН.

Звыш праграмы—цікавы культурфільм.

МАРЫЙЦЫ

Вытворчасьці «Усход-кіно» Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

Вопытны ПАМБУХ,

які ведае эканамічна-плянавую работу, шукае

вячэрнюю службу

або работу на дом, Камуністычная 20-а, кв. 3, Штэйнгардт.

ГОСТЕХИЗДАТ

ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА НОВЫЙ ДВУХМЕСЯЧНЫЙ ЖУРНАЛ

КРАСКИ и ЛАКИ

Орган научной лаборатории треста «ЛАКО-КРАСКА»

Рассчитан на практика-маляра, техника и инженера

ОСНОВНЫЕ ОТДЕЛЫ:

1) Изыскание новых составов красок и лаков, улучшение и изучение существующих продуктов лако-красочной промышленности, полуфабрикатов и сырых материалов.

2) Новейшие достижения иностранной техники в области красок, лаков и способов их применения.

3) Экономические обзоры по нашей промышленности.

4) Стандарты и нормы лако-красочной промышл.

ПОДПИСНАЯ ПЛАТА:

На 6 мес. с июля (до конца года)—3 руб.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ:

В Государственном Техническом Издательстве—МОСКВА—ГСП—2, Ильинка, пр. Владимирова. 4, в отделениях и магазинах издательства; у уполномоченных, снабженных доверенностью Гостехиздата, на почте, у письмоносцев, во всех отделениях и филиалах Госиздата РСФСР и Союзпечати (за исключением городов, где имеются отделения и магазины ГТИ).

Кіно-сад

Ад аўторка, 12 жніўня

ВЯСЁЛАЯ КАМЭДЫЯ Ў 8 ЧАСТКАХ

НА 7-м НЕБЕ

У галоўн. ролях: Выдатныя кіно-артыстыя **Гарольд Лойд і Мільдрэд Дэвіс.**

Пачатак роўна а 10 г. Каса—ад 6 г. Толькі 2 сэансы ў вечар.

ДАЙЦЕ ПРАВІЛЬНЫЯ АДРАСЫ

З прычыны няправільных адрасоў не дастаўляецца газ. «Зьвязда» наступным падпісчыкам:

1) **Каштальян.**—К. Лібкнэхта, 2-а—2.

2) **Юркевіч.**—Р. Люксембург, 14—1.

3) **Электр. арцель «Альтэрнатар»,** Савецкая, 86.

Просьба да вышэйпаказаных падпісчыкаў паведаміць у аддзел падпіскі газ. «Зьвязда» (Савецкая, 63) СВАЕ ДАКЛАДНЫЯ АДРАСЫ

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2